КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 18 (241) ◂ 6 мая ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час



Вольга Класкоўская: **«Я ПРЫЕХАЛА, КАБ ПАДТРЫМАЦЬ БРАТА»**

Стар. 4

## СА СВЯТАМ ВАС, ДАРАГІЯ ВЕТЭРАНЫ!



*Гэта ваша перамога, гэта ваша свята, дарагія ветэраны. Вы прайшлі праз пекла самай страшнай і крыважэрнай вайны ў гісторыі чалавецтва — другой сусветнай.*

*Вы вытрымалі і перамаглі.*

*Вы заваявалі і забяспечылі мірнае жыццё сваёй краіне, свайму народу, народам Еўропы і сусвету.*

*Гэта і наша свята — дзяцей, унукаў, праўнукаў і прапраўнукаў пакалення пераможцаў. Бо дзякуючы той перамозе мы ўжо 66 гадоў жывем пад мірным небам. І гэта галоўнае перад усімі праблемамі і выклікамі, якія ставіла і ставіць перад намі час і жыццё.*

*Са святам, дарагія суграмадзяне Беларусі!*

ISSN 2218-2144

ЧЫТАЙЦЕ
Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!

**СЛЫХАВЫЯ ГАЛЮЦЫНАЦЫІ**

Артыкул Сяргея Нікалюка
з цыклу «Азбука паліталогіі»

МІРНЫ АТАМ

# ПА ЕЎРОПЕ ПРАКАЦІЛАСЯ АНТЫЯДЗЕРНАЯ ХВАЛЯ

Генадзь КЕСНЕР

**«Вандроўка міру Мінск—Жэнева» з удзелам беларускіх, нямецкіх і швейцарскіх грамадскіх актывістаў, журналістаў і жыхароў раёнаў, пацярпелых у выніку катастрофы на ЧАЭС, завяршылася днямі ў беларускай сталіцы.**




Арганізатарамі дзесяцідзённай акцыі выступілі Беларускі дабрачынны фонд «Дзецям Чарнобыля» на чале з прафесарам Генадзем Грушавым і Федэральная рабочая група «Дзецям Чарнобыля» з Германіі.

Узрастанне ядзернай пагрозы ў выніку аварыі на японскай АЭС, а таксама далёка не пераадоленыя наступствы Чарнобыля ўзнялі новую, магутную хвалю пратэстаў у Еўропе супраць будаўніцтва новых і далейшай эксплуатацыі існуючых АЭС. Чаго, дарэчы, зусім не назіраецца ў Беларусі, жыхары якой найбольш пацярпелі ад «мірнага атаму».

Актуальнасць праблемы адбілася і на ўзроўні, на якім прымалі ўдзельнікаў акцыі ў Каменцы, потым у Ротвайлі (у гэтых гарадах кантакты праходзілі на ўзроўні бургамістраў), а ў сталіцы Ніжняй Саксоніі Гановеры «амбасадараў антыядзернага свету» прымаў сам прэзідэнт зямельнага парламента Герман Дзінкла. Прычым практычна на ўсіх сустрэчах адзначалася, што і сёння бракуе інфармацыі пра небяспеку выкарыстання так званага «мірнага атама» і пра яго наступствы.

«Сёння, праз 25 гадоў пасля катастрофы на ЧАЭС, мы задаём пытанне: што ж адбылося і адбываецца ўвесь гэты час? У Беларусі ўжо цэлае пакаленне звязвае сваё жыццё з Чарнобылем. Захворванні ў дзяцей набіраюць моц, з 800 000 ліквідатараў большасць ужо памерлі, вялікія тэрыторыі засталіся без жыхароў, кіраўніцтва Беларусі заяўляе пра тое, што Чарнобыль скончыўся, а Сусветная арганізацыя аховы здароўя (СААЗ) моўчкі назірае», — падкрэсліла кіраўнік «Грамадзянскай ініцыятывы за свет без ядзернай пагрозы» з Ротвайля Ангела Геслер.

Прадстаўнікі чарнобыльскіх ініцыятыў Беларусі, Швейцарыі і Германіі трапілі і ў будынак ААН у Жэневе, дзе цягам больш як дзвюх гадзін дыскутавалі наконт будучыні атамнай энергетыкі, разважалі аб праблемах, якія прынесла атамная энергетыка краіне, дзе ніколі не было сваёй АЭС. І вось тут стала адчувальна, што прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці і чыноўнікі сусветных арганізацыяў знаходзяцца, мякка кажучы, «па розныя бакі барыкад».

Нам спрабавалі давесці, што дагэтуль няма стопрацэнтных доказаў адмоўнага ўплыву на стан здароўя людзей малых доз радыяцыі, якую назапашвае чалавек праз ужыванне прадуктаў харчавання з невялікім утрыманнем радыенуклідаў. Калі карацей, то чыноўнікі спрабавалі давесці, што не такі страшны атамны чорт, як яго малююць. Гэта было б дзівакавата чуць з вуснаў прадстаўніцы Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, калі не ведаць, што гэтая структура наўпрост звязана з такой структурай, як МАГАТЭ — сусветным лабістам атамнай энергетыкі. А тым часам ужо многія і многія месяцы каля будынку СААЗ штодня праходзіць бестэрміновая «Вахта перасцярогі» — пікет, які нагадвае чыноўнікам пра наступствы Чарнобыля і выкарыстання «мірнага атаму» ўвогуле.

Яшчэ адным важным момантам «Вандроўкі міра» было наведванне гарадка Гарлебен у Ніжняй Саксоніі (ФРГ), які вядомы на ўвесь свет праз тое, што там знаходзіцца прамежкавы магільнік ядзерных адходаў. Там сёння наземным (!) чынам часова захоўваюць больш за сто кантэйнераў з высокатаксічнымі ядзернымі адходамі, якія прывозяцца туды не толькі з нямецкіх, але і французскіх ды іншых атамных станцый. Штогод, калі ў Гарлебен накіроўваецца чарговы цягнік «Кастар» са смяротна небяспечнымі кантэйнерамі, тысячы актывістаў антыядзернага руху з розных краін свету ладзяць акцыі пратэсту, спрабуючы недапусціць гэты «Кастар» да пункта прызначэння. Пакуль, на жаль, беспаспяхова.

Зямля каля Гарлебена, дзе плануецца ўзвесці цяпер ужо пастаянны падземны «адстойнік» для адпрацаванага ядзернага паліва, належыць графіні Ганне фон Бернсторф. Улады плануюць прыняць спецыяльны закон, каб нацыяналізаваць 600 гектараў зямлі, дзе маркуецца збудаваць гэты сталы магільнік. Графіня Бернсторф, якая з'яўляецца, бадай, самым актыўным змагаром з планамі ўладаў, верыць, што толькі агульнымі акцыямі пратэсту, міжнароднай салідарнасцю можна перашкодзіць «распаўсюду ядзернай заразы». Таму, як і ў Жэневе ля будынка СААЗ, у Гарлебене пастаянна праводзіцца пікет пратэсту з багатай кольксцю аўдыё- і відэаматэрыялаў на адпаведную тэматыку, тут нават разбіты пастаянны лагер праціўнікаў «мірнага атаму».

Апошнім, самым, відаць, чуллівым, мерапрыемствам нашага ваяжу стала Акцыя памяці да 25-й гадавіны катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у царкве святога Міхаіла ў горадзе Люнэбургу. Там удзельнікі акцыі ўшанавалі памяць усіх, хто стаў ахвярай атамных трагедый у Беларусі, Японіі, Украіне, Расіі, а доктар медыцыны прафесар Хэльге Шэнк прывёў жахлівыя дадзеныя пра наступствы чарнобыльскай трагедыі. Вельмі шкада, што гэтага даклада не чулі тыя апалагеты «мірнага атаму», з якімі мы сустракаліся ў Жэневе.

САЛІДАРНАСЦЬ

# ПАДТРЫМАЕМ «НАРОДНУЮ ВОЛЮ» І «НАШУ НІВУ»

**Журналісты «Новага часу» выказваюць шчырую салідарную падтрымку калегам з газет «Народная воля» і «Наша ніва», якім пагражае закрыццё.**

Народная Воля

Наша Ніва

Менавіта з іскам аб закрыцці гэтых выданняў звярнуўся ў Вышэйшы гаспадарчы суд міністр інфармацыі Праляскоўскі А. В. На 11 мая прызначана папярэдняе пасяджэнне суда па іску.

Падставы фармальныя — з прычыны вынясення рэдакцыям названых выданняў па працягу года двух і больш пісьмовых папярэджанняў. Сапраўдная ж прычына — аб'ектыўнае і ўсебаковае асвятленне беларускай рэчаіснасці, без аглядкі на афіцыйныя прапагандысцкія ўстаноўкі і забароны. За свабоднае слова.

Схема ліквідацыі — старая, якую ў свой час адчулі і мы на ўласнай скуры: у 2006 годзе, напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў, рашэннем ВГС была зачынена газета «Згода» — папярэдніца «Новага часу». Аднавіцца нам удалося толькі дзякуючы салідарнай падтрымцы калег, беларускай і міжнароднай супольнасці, а таксама наўпроставай дапамозе ТБМ.

Толькі дзякуючы салідарнасці, у супрацiве беспрэцэдэнтнаму ціску і рэпрэсіям з боку ўладаў журналісцкай незалежнай супольнасці ўдалося захаваць у Беларусі выспу свабоднага слова, незалежных СМІ.

Але наступ працягваецца.

Згуртуемся ж у салідарным супраціве. І з тым — пераможам. Інтарэс і сімпатыі людзей да незалежных СМІ, да свабоднага слова штодня прыкметна ўзрастаюць. Гэта і ёсць наш шчыт супраць рэпрэсіўнага лома.

Трымайцеся, калегі з «Нашай нівы» і «Народнай волі».

* * *

*У сёлетнім дакладзе аб стане свабоды слова ў свеце амерыканскай праваабарончай арганізацыі «Freedom House» Беларусь знаходзіцца на 190-м месцы, паміж Кубай (189) і Бірмай, якая разам з Эрытрэяй, Лівіяй і Узбекістанам раздзяляе 191-е месца. Усяго ў гэтым рэйтынгу свабоды слова 196 краінаў. На 195-м месцы знаходзіцца Туркменістан, а спіс замыкае Паўночная Карэя.*

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# СПЕЦАПЕРАЦЫЯ СУПРАЦЬ ПРАВААБАРОНЦАЎ

Таццяна ШЭЛЕГ

**Супрацоўнікі праваахоўных органаў сарвалі прэзентацыю справаздачы пра падзеі 19 снежня, падрыхтаваную міжнароднымі экспертамі.**

Замежных праваабаронцаў даставілі ў міліцыю. Да іх вызвалення падключыліся амбасады Расіі і Беларусі.

У Мінску 4 мая была прызначана відэаканферэнцыя Ніла Джармана, спецдакладчыка Камітэта міжнароднага кантролю за сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі. Ён збіраўся выступіць з аналізам падзей 19 снежня. Гэта справаздача — першая незалежная прававая ацэнка снежаньскіх падзей у Беларусі, падрыхтаваная міжнароднымі экспертамі.

У 18.30, за паўгадзіны да пачатку прэзентацыі даклада, у офіс праваабарончага цэнтра «Вясна» прыйшлі супрацоўнікі міліцыі і міграцыйнай службы. Яны заявілі, што да іх паступіла інфармацыя, быццам у офіс нейкія людзі заносілі скрыні. І гэта стала падставай для праверкі памяшкання на наяўнасць выбуховых рэчываў. Пасля таго, як меркаваная «бомба» знойдзена не была, прысутных забралі ў міліцыю. Таксама ў РУУС Першамайскага раёна адвезлі і некалькі праваабаронцаў, якія прыйшлі да офісу пазней. Іх забралі непасрэдна з вуліцы. Міліцыянты заявілі, што гэта робіцца з мэтай высвятлення падставы знаходжання праваабаронцаў у Беларусі.

Сярод затрыманых аказаліся грамадзяне Расіі Любоў Захарава, Вікторыя Громава, Юры Джыбладзэ, Ірына Пайкачава, Аляксандр Мнацаканян і грамадзянін Украіны Уладзімір Чамярыс. Расійскі консул накіраваўся ў міліцыю для высвятлення прычынаў затрымання. Амбасадар Украіны ў Беларусі паведаміў, што інфармацыя аб затрыманні ўкраінскага грамадзяніна будзе даведзеная да МЗС ягонай краіны. Пасля таго, як праваабаронцы далі тлумачэнні, іх вызвалілі.

Кіраўнік Міжнароднай назіральнай місіі Андрэй Юраў адзначыў, што даклад пра падзеі 19 снежня падрыхтавала незалежная экспертная групай пад кіраўніцтвам Ніла Джармана. Ён з'яўляецца кіраўніком групы экспертаў АБСЕ па свабодзе сходаў, а таксама ўзначальвае Інстытут па вывучэнні канфліктаў у Паўночнай Ірландыі. «Відаць значэнне даклада было ацэнена і прадстаўнікамі ўлады. Пра што сведчыць такая нечаканая і жорсткая рэакцыя на яго прэзэнтацыю», — заявіў Андрэй Юраў.

Праваабаронцам з Міжнароднай назіральнай місіі Аляксандру Мнацаканяну і Вікторыі Громавай прадпісана пакінуць Беларусь на працягу 24 гадзінаў.

СУДЫ

# ШТО БЫЛО НА ПЛОШЧЫ 19 СНЕЖНЯ?

Таццяна ШАПУЦЬКА

**Аднавіліся працэсы над удзельнікамі акцыі 19 снежня 2010 года.**

У судзе Кастрычніцкага раёна Мінска разглядаюцца справы гісторыка Дзмітрыя Дразда, праграміста Алеся Пратасені, сябра «Маладога Фронту» Алеся Кіркевіча, г. зв. «агента Навушніка» Уладзіміра Хамічэнкі і актывіста кампаніі «Гавары праўду» Паўла Вінаградава.

На Вінаградава, дарэчы, былі заведзены дзве крымінальныя справы: за ўдзел у масавых беспарадках і за абразу дзяржаўных сімвалаў. Пад апошнім пракуратура разумела спальванне на вогнішчы плакатаў з вывай Лукашэнкі. Файл з відэазапісам спальвання быў знойдзены на сканфіскаваным кампутары Вінаградава. Усе прысутныя ў залі прагледзелі відэа, пасля чаго пракурор Бароўскі падаў хадайніцтва аб спыненні крымінальнай справы за знявагу дзяржаўных сімвалаў на падставе заканчэння тэрміна даўніны. Хадайніцтва было задаволенае.

У судзе ў якасці сведак выступалі пастары пратэстанцкіх цэркваў Уладзімір Качагур і Павал Руды, намесніца старшыні «Маладога Фронту» Наста Палажанка. Яны распавядалі, што настрой вулічнай дэманстрацыі быў выключна мірны, і людзі не імкнуліся ўчыняць бясчынстваў, гаварылі пра адсутнасць факта масавых беспарадкаў. У сваю чаргу, пракурор заявіў, што рашэнні мінулых судоў, якія ацэньвалі падзеі на плошчы Незалежнасці 19 снежня як «масавыя беспарадкі», уступілі ў сілу, а таму дзеянні цяперашніх падсудных павінны трактавацца аналагічным чынам.

«З юрыдычнага пункту гледжання існуюць факты, якія не патрабуюць даказвання ў судовым следстве. Іх відам з'яўляюцца судовыя прысуды, што ўступілі ў законную сілу (прысуды Парфянкова, Атрошчанкава, Новіка, Малчанава, Ліхавіда). Але мы ставім пад сумнеў і гэтыя прысуды, і факт наяўнасці масавых беспарадкаў, што павінны суправаджацца сукупнасцю такіх дзеянняў як падпалы, пагромы, гвалт з асобы, знішчэнне маёмасці, узброены супраціў прадстаўнікам праваахоўных органаў улады. На нашу думку, факт масавых беспарадкаў не быў даказаны падчас судовых разбіральніцтваў, а таму носіць надуманы характар», — гаворыць праваабаронца ПЦ «Вясна» Наста Лойка.

Нягледзячы на адпор боку абароны, суд прызначыў: па 3 гады — Пратасеню, Хамічэнку і Дразду; па 4 гады — Кіркевічу і Вінаградаву.

# СВЕДЧАННІ АБ ПРАВАКАТАРАХ

Альбіна ВІШНЕЎСКАЯ

**Біць шкло Дома ўраду пачалі правакатары. А міліцыя іх не спыняла. Пра гэта ў судзе над экс-кандыдатам у прэзідэнты Андрэем Саннікавым і яшчэ чатырма абвінавачанымі даюць паказанні ўсё новыя і новыя сведкі.**

Юрыст Уладзімір Лабковіч распавёў: тых, хто біў дзвярное шкло, было каля 10 чалавек, абсалютна яму не знаёмых. Побач стаялі афіцэры. Ён і кіраўнік Беларускага Хельсінкскага камітэта Алег Гулак спыталі, чаму яны не ўмешваюцца і не наводзяць парадак. А ў адказ пачулі, што іх не хвалюе тое, што адбываецца, і яны не збіраюцца ўмешвацца ў дзейнасць гэтых грамадзян.

Журналіст Алег Груздзіловіч засведчыў, што ў момант біцця шкла ля дзвярэй Дома ўраду не было ўдзельнікаў мітынгу. Гэта былі людзі, якія прыйшлі туды раней. Спачатку на прыступках з'явіліся 2–3 чалавекі: пабілі шкло і зніклі.

Ля помніка Леніну пачаўся мітынг. А потым пачалі біць шкло другім разам — каля 10 чалавек. «Гэта былі дзіўныя людзі, якія механічна дзяўблі гэтае шкло з невядомай мэтай, ніяк паміж сабой не перамаўляліся», — сказаў Алег Груздзіловіч. Потым да іх падышлі ўдзельнікі акцыі і журналісты. Агулам на прыступках Дома ўраду сабралася каля 30–40 чалавек.

Паводле словаў журналіста, палітыкі казалі людзям, што гэта правакацыя і яе трэба спыніць.

Экс-кандыдат Віталь Рымашэўскі таксама выступіў на судзе Саннікава як сведка. «Я спыняў людзей, але адзін гэта зрабіць не здолеў. Тады я паспрабаваў сабраць людзей і выставіць ланцуг. Гэта ўжо амаль удалося, але ў гэты момант выйшаў спецназ», — адзначыў палітык.

Праваабаронца Алесь Бяляцкі, які выступіў у судзе, расцаніў паводзіны міліцыі як «абсалютна бездаказныя». «Шмат з таго, што адбылося ля Дома ўраду, стала магчымым з-за бяздзейнасці міліцыі і адсутнасці ў іх кантакту з дэманстрантамі. Быў бы гэты кантакт, мы б тут не сядзелі», — перакананы ён.

Сіла супраць дэманстрантаў ужывалася неабгрунтавана. У іх не было ў руках ніякіх прыладаў. Але людзі былі моцна збітыя спецназаўцамі. «Не было масавых беспарадкаў, чаму вы такія артыкулы пішаце?» — звярнуўся Алесь Бяляцкі да дзяржаўнага абвінаваўцы Антона Загорскага. Пытанне засталося без адказу.

Пенсіянер Пётр Кучко прынёс у суд фотаздымкі, зробленыя мабільным тэлефонам адразу пасля разгону акцыі на плошчы Незалежнасці. Ніякіх бутэлек, арматуры, лёдарубаў, каністраў і ўсяго іншага, што потым паказала БТ у фільме «Жалезам па шклу», на плошчы не было. Фальшыўка настолькі абурыла пенсіянера, што ён выразна абвергнуць гэта ў судзе. Прысутныя ў залі таксама не змаглі стрымаць эмоцый і заапладзіравалі Пятру Кучко.

У судовым працэсе над Андрэем Саннікавым, Фёдарам Мірзаянавым, Уладзімірам Яроменкам, Іллём Васілевічам і Алегам Гнедчыкам выказалі жаданне выступіць сведкамі 20 чалавек.

# ПАЭТА ЎСЁ Ж СУДЗЯЦЬ

**У судзе Фрунзенскага раёна Мінска 5 мая пачаўся працэс па справе двух былых кандыдатаў у прэзідэнты Беларусі — Уладзіміра Някляева і Віталя Рымашэўскага.**



Палітыкі абвінавачваюцца па ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэкса (арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх).

Суддзя Жанна Жукоўская ахіліла хадайніцтва экс-кандыдата ў прэзідэнты Уладзіміра Някляева пра спыненне крымінальнай справы і заявіла, што пытанне пра наяўнасць злачынства ў яго дзеяннях будзе вырашана ў судзе. Было адхілена і хадайніцтва адваката Уладзіміра Букштынава пра змяненне меры стрымання Някляеву з хатняга арышту на падпіску пра нявыезд. Адвакат звярнуў увагу на тое, што Някляеў абвінавачваецца ў злачынстве, якое прадугледжвае альтэрнатыўныя пазбаўленню волі пакаранні.

Разам з Някляевым і Рымашэўскім судзяць сяброў іх ініцыятыўных груп — Андрэя Дзмітрыева, Аляксандра Фядуту, Насту Палажанку і Сяргея Вазняка, якія таксама абвінавачваюцца па ч. 1 арт. 342. Вазняк апроч гэтага абвінавачваецца па ч. 1 арт. 401 КК (свядома лжывае сведчанне).

А ў судзе Маскоўскага раёна пачаўся працэс над Дзмітрыем Дароніным, Сяргеем Казаковым, Уладзімірам Лобанам, Віталем Мацкевічам, Яўгенам Сакрэтам, Алегам Федаркевічам. Яны абвінавачваюцца па ч. 2 арт. 293 (масавыя беспарадкі). Суддзя — Алена Шылько.

11 мая ў судзе Ленінскага раёна пачнецца працэс над яшчэ двума экс-кандыдатамі Мікалаем Статкевічам і Дзмітрыем Усам.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# СУМНЫЯ СВЯТЫ



Сяргей САЛАЎЁЎ

**З чым у сталых людзей, якія яшчэ паспелі пажыць пры СССР, асацыююцца першамайскія святы? Правільна, менавіта са святамі. Па-першае, шмат выходных, паветраныя шарыкі, абавязковае застолле пасля дэманстрацыі і магчымасць пасадзіць бульбу на прысядзібным участку. Зараз «свята працы» — ужо зусім не тое свята. Канешне, за выключэннем магчымасці пасадзіць бульбу.**

Асабліва ў гэтым годзе. Беларусь заняла другое месца сярод краін былога СССР па росце спажывецкіх цэн у першым квартале гэтага года (сакавік да снежня — 6,1%). Пра гэта сведчыць аналіз звестак нацыянальных органаў статыстыкі.

На першым месцы Кыргызстан (6,4%). За Беларуссю ідуць Арменія (5,2%), Грузія (4,9%), Таджыкістан (4,5%), Азербайджан (4,1%), Расія (3,8%), Казахстан (3,7%), Малдова, Украіна (па 3,3%), Латвія (2,3%), Літва (1,5%) і Эстонія (1,4%). Наконт Узбекістана і Туркменістана звестак няма.

Па росце цэн у сакавіку (1,9%) Беларусь на другім месцы пасля Кыргызстана (2,2%). Далей — Украіна (1,4%), Таджыкістан (1,2%), Азербайджан (1,1%), Літва (1%), Арменія, Малдова, Эстонія (па 0,8%), Латвія (0,7%), Расія (0,6%) і Казахстан (0,5%). У Грузіі цэны не змяніліся.

Ну, добра, Кыргызстан — яны там яшчэ не ачомаліся ад праўлення Курманбека Бакіева, які сябе ўтульна адчувае ў Беларусі. Увогуле, Кыргызстан — адна з найбяднейшых краінаў Сярэдняй Азіі. Але ж мы жывем не ў Азіі, а ў Еўропе! І, дарэчы, не бяднейшая краіна! Мы заўсёды ганарыліся нашым «эканамічным цудам». Ганарыліся, ганарыліся, а тут высвятляецца, што ніякага цуду няма, і мы бяднейшыя нават за Малдову і Украіну.

Больш за тое, Беларусь заняла чацвёртае месца сярод краін былога СССР па тэмпах росту афіцыйнага курсу долара ЗША да нацыянальнай валюты за першыя чатыры месяцы 2011 года. У пяцёрку краін, дзе долар падаражэў, увайшлі Узбекістан — тут курс узрос на 3,14% (з 1 640 да 1 691,57 сума), Таджыкістан — на 2,33% (з 4,4031 да 4,5059 самоні), Арменія — на 1,88% (з 363,44 да 370,27 драма), Беларусь — на 0,43% (з 3 000 да 3 013 рублёў) і Украіна — на 0,05% (з 7,9617 да 7,9654 грыўні).

А ў вышэй згаданым Кыргызстане долар нават патаннеў — на 0,68% (з 47,0992 да 46,7766 сома)! Дык дзе мы жывем — у Еўропе або ў Азіі?

Сусветны дзень свабоды друку, які адзначаецца 3 мая, таксама не быў радасным для журналістаў Беларусі. Незалежная журналістыка Беларусі сёння «ў небяспецы, бо з'яўляецца адной з галоўных пагроз рэжыму», — кажа старшыня РГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (БАЖ) Жанна Літвіна.

«Усё складаней кантраляваць грамадскую свядомасць і падпарадкоўваць настрой людзей, — перакапана лідар БАЖ. — Прапагандысцкая машына «прабуксоўвае». Спрацоўвае прынцып: чым больш прапаганды, тым менш веры». Сведчаннем таму, адзначае Літвіна, сталі і валютная паніка, і цукровая ліхаманка. Эканамічная сітуацыя дыктуе паводзіны ўлады. Ёй сёння нічога не застаецца, як ісці на абвастрэнне ўзаемадачыненняў з масмедыя і ўзмацняць пераслед, вылучаючы самыя дзікунскія абвінавачанні», — лічыць Літвіна.

Жанна Літвіна пажадала мужнасці калегам, якія ўжо асуджаны на зняволенне (Аляксандр Атрошчанкаў, Дзмітрый Бандарэнка), тым, хто яшчэ чакае прысудаў (Сяргей Вазняк, Аляксандр Фядута, Ірына Халіп, Павел Севярынец), а таксама стойкасці — калектывам газет «Наша ніва» і «Народная воля», якія могуць быць закрыты з ініцыятывы Міністэрства інфармацыі.

Пакуль што журналісты змагаюцца як могуць. На адкрыцці XV Мінскай міжнароднай выставы «СМІ ў Беларусі» 4 мая прайшоў флэшмоб супраць закрыцця недзяржаўных газет «Наша ніва» і «Народная воля». Удзельнікі акцыі акружылі чыноўнікаў з Міністэрства інфармацыі, у прыватнасці міністра Алега Праляскоўскага і яго намесніка Лілію Ананіч, трымаючы асобнікі газет. Прадстаўнікі Мінінфарма, у сваю чаргу, адмовіліся каментаваць сітуацыю вакол гэтых незалежных выданняў.

Намеснік галоўнага рэдактара газеты «Народная воля» Марына Коктыш адзначыла, што ўдзельнікі акцыі хацелі прыцягнуць увагу да праблем, з якімі сутыкнулася незалежная прэса. Адмова чыноўнікаў каментаваць верагоднае закрыццё газет Коктыш назвала «нямым адыходам Міністэрства інфармацыі», што вынесла выданню «надуманае папярэджанне», якое «Народная воля» «не можа абскардзіць у судзе».

Невясёлы падарунак атрымала і ўлада. У Брусэлі 3 мая прайшло ўстаноўчае пасяджэнне Парламенцкай асамблеі праграмы Еўрасаюза «Усходняе партнёрства». Канферэнцыя старшыняў палітычных фракцый Еўрапарламента 10 лютага прыняла рашэнне аб скліканні першага пасяджэння Еўранеста без беларускай дэлегацыі. Пастанова пачаць працу Еўранеста без прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці і парламента Беларусі была прынятая ў Еўрапарламенце аднагалосна.

Раней меркавалася, што ў працы Парламенцкай асамблеі праграмы Еўрасаюза «Усходняе партнёрства» (Еўранест) возьмуць удзел 60 еўрадэпутатаў, а таксама па 10 прадстаўнікоў (у асноўным парламентарыяў) ад Грузіі, Украіны, Арменіі, Азербайджана, Малдовы і Беларусі. Адносна апошняй разглядаліся розныя варыянты: запрашэнне выключна апазіцыі або апазіцыі і пяці прадстаўнікоў парламента. Аднак гэтыя ідэі не знайшлі разумення ні ў афіцыйнага Мінска, ні ў шэрагу краін — суседзяў ЕС.

Так што Еўропа — зноў без нас.

Гаспадарчы суд Мінска 4 мая адмовіў грамадскаму аб'яднанню «БНФ «Адраджэньне» ў іску да ЖРЭА Савецкага раёна сталіцы адносна працягу арэнды офіса арганізацыі па праспекце Машэрава, 8.

Падчас судовага разгляду іску юрыст аб'яднання Уладзімір Лабковіч заклікаў суд улічваць не толькі юрыдычны, але і маральна-этычны аспект справы. «Памяшканне на Машэрава, 8 вядомае як частка гісторыі і культуры Беларусі», — падкрэсліў ён, нагадаўшы, што днямі ліст у абарону офіса падпісалі 100 дзеячаў навукі, культуры, мастацтва, праваабаронцаў, журналістаў.

Падчас судовага пасяджэння ЖРЭА было прапанавана падпісаць міравое пагадненне, пры гэтым аб'яднанне гатовае было згадзіцца на больш жорсткі парадак аплаты арэнды офіса. Аднак прадстаўнік ЖРЭА адмовіўся яго падпісваць. Цяпер у судзе разглядаецца аналагічны іск да ЖРЭА з боку Партыі БНФ. Справа ў тым, што ў памяшканні па праспекце Машэрава, 8 з 1992 года знаходзіцца цэнтральны офіс і грамадскай арганізацыі, і Партыі БНФ, а таксама некалькі іх арганізацыйных структур.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### МІКАЛАЙ ЛАДУЦЬКА

Старшыня Мінгарвыканкаму Мікалай Ладуцька поўны аптымізму і пазітыўных ацэнак з нагоды валютнага дэфіцыту і крызісу ў эканоміцы. Якога, паводле меркавання чыноўніка, няма, але ёсць беларусы-мільярдэры, што ўціхую пад сваімі матрацамі назапашваюць стратэгічныя еўра і долары. «Валюты ў краіне дастаткова, сёння ўжо і «залежныя», і незалежныя эканамісты кажуць, што ў беларускага насельніцтва сфармаваныя накапленні ў 12–14 мільярдаў долараў», — заявіў журналістам старшыня Мікалай Ладуцька 1 мая на святочным мітынгу Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ў Мінску.

Ён нагадаў, што ў мінулую пятніцу прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч быў з візітам у Салігорску, на закладцы новага заводу мінеральных угнаенняў. «Беларуская калійная кампанія ўстойліва працуе ў партнёрстве з расійскімі кампаніямі, — паведаміў Ладуцька. — І сотні тысяч тон штомесяц адгружаюцца спажыўцам — яны расплачваюцца валютай, якая паступае ў Нацыянальны банк. Але мы кажам пра іншае: сёння за валюту мы купляем нафту, газ, медыкаменты. У каго з мінчукоў сёння дома не было гарачай вады, была адключаная электраэнергія, зімой заставаліся халоднымі батарэі? Чатыры дні выходных — людзі выязджалі за горад. 12 тон шашлыкоў куплена — мяса ж не падаражэла, як, дапусцім, імпартныя шакаладкі, на 60%, праўда?» — дадаў чыноўнік.

### ЗІНАІДА БАНДАРЭНКА



Народная артыстка Беларусі звярнулася да кіраўніка Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з адкрытым лістом, у якім яна спрабуе засцерагчы кіраўніка краіны «ад шматлікіх памылак», у тым ліку ад закрыцця «Народнай Волі» і «Нашай Нівы».

«Пакуль выходзіць «Народная Воля», пакуль ёсць дзе выказацца, пакуль яшчэ можна не дапусціць горшага. Спыніцеся, Аляксандр Рыгоравіч! Не бярыце грэх на душу: не ламайце лёсы і жыцці людзей, — гаворыцца ў лісце. — Пасля нашай апошняй сустрэчы з Вамі, Аляксандр Рыгоравіч, прайшло 12 гадоў. Тая сустрэча адбылася на Макаёнка, 9, калі Вы прыязджалі на Белтэлерадыёкампанію, каб сказаць «дзякуй» журналістам, што падтрымалі Вас у прэзідэнцкай выбарчай кампаніі на другі тэрмін. Я не ўваходзіла ў лік тых журналістаў, і мне ў хуткім часе давялося сысці з тэлебачання. Шмат чаго адбылося за гэтыя гады і ў маім жыцці, і ў Вашым: некалькі разоў я ў думках намагалася звярнуцца да Вас на правах даўняга знаёмства і з тым, каб засцерагчы ад шматлікіх памылак. І вось цяпер, улічваючы небяспечную сітуацыю ў Беларусі, я ўсё ж звяртаюся... Вы добра ведаеце, што спецслужбы падчас выбараў перайгралі саміх сябе, зрабілі і Вас асабіста, і беларусаў закладнікамі перад Захадам і перад Расіяй. І я звяртаюся да Вас ад імя беларускіх жанчын, якім неабыякавы лёс нашай краіны: дайце загад вызваліць усіх зняволеных за падзеі 19 снежня 2010 года. Не падзяляйце беларусаў на сваіх і чужых... Душа баліць за ўсіх зняволеных, асабліва за тых, у каго засталіся малыя дзеткі. Вы, як бацька малога дзіцяці, добра разумееце, што можа стацца з Вашым маленькім сынам, калі Вас, Аляксандр Рыгоравіч, адарваць ад яго... Падумайце, як пачуваюць сябе дзеткі беларускіх зняволеных. Падумайце, як пачуваюць сябе дзеткі журналістаў недзяржаўных газет, чыіх бацькоў Вы вырашылі пакінуць без працы толькі за тое, што яны маюць іншыя думкі і іншыя погляды. Спыніце гэты наступ. Не дзяліце дзяцей на «правільных» і «няправільных»!..»

### СВЯТЛАНА ШАЎЧЭНКА



У Беларусі магчымы рэзкі рост беспрацоўя і ўзнікненне сацыяльнай напружанасці ў выпадку захавання існуючай сітуацыі на валютным рынку, мяркуе дырэктар Навукова-даследчага інстытута Міністэрства працы і сацыяльнай абароны насельніцтва Беларусі Святлана Шаўчэнка. «Рэзкі рост беспрацоўя магчымы, калі не будзе вырашана самае галоўнае на сённяшні дзень пытанне — стварэнне ўмоў для свабоднага канвертавання беларускага рубля», — заявіла Святлана Шаўчэнка interfax.by. Каментуючы агучаныя кіраўніком Белстата Уладзімірам Зіноўскім дадзеныя аб тым, што за апошні час 600 тысяч працаўнікоў былі вымушаныя часова прыпыніць сваю дзейнасць, Шаўчэнка адзначыла: «Хутчэй за ўсё, гэта ўсё адбылося на працягу красавіка. Праблемы на валютным рынку прывялі да адсутнасці прадметаў працы і, адпаведна, да адсутнасці вынікаў працоўнай дзейнасці. У гэтай сітуацыі наймальнік не можа трымаць работнікаў, якія нічога не вырабляюць».

ЛЁСЫ

# Вольга Класкоўская: «Я ПРЫЕХАЛА, КАБ ПАДТРЫМАЦЬ БРАТА»

**Праслед іншадумцаў уносіць карэктывы ў лёсы не толькі вязняў, але і іх сем'яў. Вольга Класкоўская, сястра арыштаванага Аляксандра Класкоўскага, тыдзень таму вярнулася ў Беларусь пасля шасці гадоў эміграцыі. Яна патлумачыла ваё рашэнне адмовіцца ад палітычнага прытулку намерам падтрымаць брата, яго сям'ю. Быць побач з роднымі ў цяжкія часіны іх жыцця. З Вольгай Класкоўскай журналіст «НЧ» Вольга Хвоін размаўляла пра трагедыі, што нітуюць сем'і і чужых людзей, пра «агні вялікага горада» і настальгію па радзіме.**



Вольга Класкоўская

— Пра стан здароўя Аляксандр не піша. Мяркую, што ён пра многае не піша, бо цэнзары з КДБ папросту не прапусцяць. Я атрымала ўжо два лісты ад брата, і ў адным з іх частка тэксту закрэслена чорным атрамантам. Палітвязні цяпер стараюцца пісаць нейтральна, каб іх лісты даходзілі на волю. Аляксандр падкрэслівае, што гатовы да любога развіцця падзей. Ён юрыст па адукацыі і выдатна разумее, што чатыры абвінавачванні па трох артыкулах не скончацца мяккім прысудам. Таму маральна ён падрыхтаваны да жорсткага прысуду. Вельмі сумуе па дзецях, просіць, каб перадавала прывітанні ад яго. Сям'я для Сашы — вельмі балючая тэма, у часе зняволення ён заўжды падкрэслівае, што найперш хвалюецца за сваіх родных. У апошнім лісце падзякаваў за шашкі, шахматы, нарды, якія я перадала яму ў СІЗА КДБ, сказаў, што гэта было цэлае свята, бо ўсёй камерай вечар гулялі ў нарды. З пэўных крыніцаў я атрымала інфармацыю, што, магчыма, пакаранне ён будзе адбываць ва ўстанове пры турме для супрацоўнікаў праваахоўных органаў. Калі будзе так, то для Сашы гэта плюс, бо сярод прадстаўнікоў свайго цэху ўсё ж лягчэй.

***— Ці былі ў вас складанасці з перадачамі ў следчы ізалятар, у чым найперш маюць патрэбу зняволеныя?***

— У мяне не было праблемаў з перадачамі. Але ёсць абмежаванні па вазе, і мы свой ліміт перадач ужо вычарпалі — гэта прыкладна тры перадачы ў месяц атрымліваецца. Але можна амаль штодня дасылаць пасылкі, абмежаванняў няма. Наколькі ведаю, усё даходзіць. Адзінае патрабаванне — усё мусіць быць у празрыстых пакунках, каву, цукар трэба перасыпаць. Саша вельмі дзякаваў за садавіну, гародніну, бо там не хапае вітамінаў. Важна не забывацца пра нашых блізкіх, бо кожная перадача — гэта свята для іх. Апроч таго, ёсць пэўныя правілы паводзінаў з сукамернікамі — прынята дзяліцца, калі табе нешта перадаюць з волі. Саша не паліць, але прасіў перадаваць яму цыгарэты, думаю, каб дзяліцца з калегамі па няшчасцю. Важна імкнуцца зглядзіць шэрасць будняў, дасылаць нешта забаўляльнае. Настольныя гульні я перадавала з парады жонкі Аляксандра Атрошчанкава.

***— Ці ёсць у вас паразуменне са сваякамі палітвязняў, маўляў, Аляксандр працаваў у гэтай сістэме, дык заслужыў такое?***

— Ніякіх папрокаў, непаразумення няма. Больш за тое, родныя палітвязняў для мяне цяпер самыя блізкія людзі. Мы стэлефаноўваемся, сустракаемся, каля Чырвонага касцёла ў Мінску молімся за нашых родных. Ды і проста маральна мы падпітваем адзін аднаго. Гора зблізіла нас. Я цешуся, што цяпер маю кола такіх шчырых, надзейных, высакародных сяброў.

***— Ці зрушылася справа з адмовай у набыцці кватэры для шматдзетнай сям'і Аляксандра?***

— На гэтым тыдні Сашава жонка Наталля атрымала ліст з выканкаму, што сям'я ўсё ж уключаная ў ільготнае крэдытаванне як шматдзетная. Але ўсе тэрміны мінулі, у кватэры, якую яны будавалі, пачынаецца аддзелка. Былі ўнесеныя сродкі на будаўніцтва, Саша быў галоўным кватэраздымшчкам па дакументах, але, калі трапіў у следчы ізалятар, стаў лічыцца неплацежаздольным. Жонка пачала пераафармляць дакументы на сябе, але з-за таго, што следчы КДБ затрымаў генеральную даверанасць на імя Наталлі, застаецца мізэрны шанец, што сям'я адвае сваё жыллё. Але я не збіраюся гэтую тэму пакідаць, я для таго і прыехала, каб падтрымліваць брата і яго сям'ю. Будзем дамагацца, каб Сашава сям'я мела свой кут, і яму было куды вярнуцца.

***— Дзеці Аляксандра Класкоўскага ведаюць, дзе іх тата?***

— Старэйшаму сыну адзінаццаць гадоў, дачцэ — сем, і яны ведаюць, што здарылася з бацькам. Малодшаму — Арсеню — сёлета будзе толькі тры гадкі. Сваякі вырашылі яму нічога не паведамляць, бо навошта рабіць траўму. Праўда, хлопчык глядзеў беларускую тэлевізію і ў адным з прапагандысцкіх фільмаў пабачыў бацьку. Даводзілася прыкласці намаганні, каб крыху патлумачыць сітуацыю. Дзеці перажываюць, бо былі моцна звязаныя з бацькам. Жонка таксама перажывае, ды і мы, родныя. Гэта адзіны суцэльны боль.



Лёша, Даша і Арсень Класкоўскія

***— Нядаўна буйныя дзяржаўныя СМІ надрукавалі артыкул, у якім ганьбіцца і ваш брат, і бацька — Аляксандр Класкоўскі, вядомы журналіст. Як гэта было ўспрынята?***

— Мой бацька Аляксандр Класкоўскі — дасведчаны, прафесійны журналіст. Ён уздымае непрыемныя для сённяшніх уладаў тэмы, але прыдрацца юрыдычна да яго матэрыялаў складана. І застаецца толькі дыскрэдытаваць асобу. Але гэта смеху вартае. Бацька па-філасофску паставіўся, і нават з гумарам. Мяне больш за ўсё пакарабаціла, што аўтар гэтых пасквіляў майго брата назваў злачынцам. Калі б была нармальная цывілізаваная краіна, то мы б гэта ўжо абмяркоўвалі ў судзе. Бо людзі нават без юрыдычнай адукацыі ведаюць пра прэзумпцыю невінаватасці. І да рашэння суда, хай нават і беларускага, ніхто не мае права, тым больш публічна, называць чалавека злачынцам. Быў намер дыскрэдытаваць нашу сям'ю, але гэта выклікае толькі смех.

***— Вы адмовіліся ад палітычнага прытулку ў Еўропе, хаця пражылі там шэсць гадоў, вярнуліся ў Беларусь дзеля брата. Але ў мяне склалася ўражанне, што вы там не прыжыліся.***

— Ад самога моманту, калі пераехала беларуска-польскую мяжу ў 2005 годзе, я марыла вярнуцца на Бацькаўшчыну. Я аб'ехала ўсю Еўропу. Былі розныя моманты — і ўзлёты, і падзенні. Але настальгія, вакуум, адсутнасць рэальных сяброў, звыклага асяроддзя, сваякоў... Агні вялікага гораду не заменяць гэтых святых рэчы. Калі б не здарылася гэтай трагедыі, я б усё адно вярнулася на радзіму. Я не шкадую пра сваё вяртанне, нягледзячы ні на што. У мяне проста крылы выраслі. Гэта вялікая падпітка ад сяброў, ад родных. Я не магу словы падабраць, проста цудоўна...

***— Вы заўважылі, што там у вас не было сапраўдных сяброў. Гэта значыць, што да эмігрантаў ставяцца з насцярогай?***

— Канешне. Маімі сябрамі былі беларусы, якіх я сустрэла за мяжой. Напрыклад, у Швецыі, я лічу, адна з лепшых беларускіх дыяспар. У нас дагэтуль цёплыя, шчыльныя стасункі. Але гэта кропля ў моры. Я паўсюдна адчувала сябе ізгоем. Міграцыйныя структуры, большасць прадстаўнікоў заходняга грамадства не саромеюцца падкрэсліць сваю грэблівасць, часам, падаецца, нават асалоду ад гэтага атрымліваюць. Гэта не залежыць ад тваіго развіцця, здольнасцяў. Проста адкрыта кажуць: ты тут госць, і калі нешта не падабаецца, вяртайся на сваю радзіму.

***— Цяпер многія маладыя беларусы загаварылі пра эміграцыю, бо не бачаць сваёй будучыні ў Беларусі. Да чаго варта рыхтавацца тым, хто наважыцца змяніць краіну жыхарства?***

— Перш за ўсё, раю вельмі добра падумаць, усё ўзважыць, усе плюсы і мінусы. Для чалавека, які цесна зніталаваны з радзімай, боль настальгіі будзе жудасным. Канешне, калі ёсць пагроза жыццю, волі, то выбіраць не даводзіцца. Пражыўшы гады за мяжой, магу сказаць, што гэта ілюзія — агні вялікага града. Ніхто нас нідзе не чакае. Адразу скажу, што будзе цяжка. Нават калі будзе крыніца даходу, калі адваеш свой сацыяльны плацдарм. Я сустракала беларусаў, у якіх ледзь па вар'ятні не даходзіла, бо настальгія ламала іх. Гэтыя сталыя людзі часам плакалі як малыя дзеці, калі размаўлялі пра Беларусь. Калі ёсць выбар, я раю заставацца ў Беларусі.

***— Наколькі беларускія праблемы зразумелыя, блізкія еўрапейцам?***

— Магу сказаць, што больш за ўсіх разумеюць, арыентуюцца, спачуваюць нам палякі. Бо яны блізкі нам народ, да таго ж мелі падобныя трагічныя старонкі ў сваёй гісторыі. Там любы чалавек — ці то прыбіральшчык, ці то выкладчык — добра арыентуецца ў нашай сітуацыі. Я шмат спачування бачыла і чула ад палякаў. Што тычыцца Заходняй, Паўночнай Еўропы, то мала хто называе нас Беларуссю — мы для іх Белая Расія. Наколькі яны ведаюць, што да чаго ў нас? З гэтым знаёмыя палітыкі, праваабаронцы, журналісты. Для шараговага абывацеля нашая краіна закрытая, ды і не надта яны цікавяцца. Магу сказаць пра Швецыю, дзе пасля апошніх выбараў цікаўнасць да Беларусі павялічылася, было многа інфармацыі ў СМІ. Гучыць банальна, але са свайго досведу эміграцыі магу сказаць: беларусы мусяць самі навесці парадак у краіне, ніхто за нас гэтага не зробіць.

***— У якім з гарадоў Еўропы вы пачуваліся найбольш камфортна?***

— Варшава. Польшча — славянская краіна; сугучнасць менталітэту, іншых рэчаў, блізкасць да нас. Я амаль год пражыла ў Парыжы, але ён падаўся мне чужым, не магу сказаць, што я адчуваю настальгію па гэтым горадзе, хаця многія мараць патрапіць туды хаця б на дзеньдва. Стакгольм уразіў сваёй раскіданасцю. Мы прызвычаіліся, што ў нас усё кампактна, а ў Швецыі ўсё раскідана. Часам, каб дабрацца да нейкага месца, у Стакгольме трэба было патраціць палову дня. Што тычыцца прыгажосці, то, паклаўшы руку на сэрца, для мяне Мінск — самы прыгожы горад.

***— Як змянілася Беларусь за час вашай адсутнасці тут?***

— Я дагэтуль не маю цэлай карціны, бо шэсць гадоў — вялікі тэрмін. Калі выпадаеш з асяроддзя, трошкі пачуваешся іншаземцам. Я прыглядаюся, адкрываю для сябе Беларусь наноў. Радуе, што паболела беларускай мовы ў тым жа транспарце, змяніўся настрой у грамадстве. У 2005 годзе было менш палітычна заангажаваных людзей. Канешне, ёсць кантраст па ўзроўню жыцця, бо мы прайграем. Не магу пакуль прызвычаіцца да сэрвісу ў крамах. А Мінск, мой горад, парадаваў. Камфортны, еўрапейскі. Тым больш, што мне ёсць з чым параўноўваць.

***

Былы супрацоўнік міліцыі лейтэнант Аляксандр Класкоўскі быў затрыманы ў ноч на 21 снежня ў сябе дома ў сувязі з удзелам 19 снежня ў несанкцыянаванай акцыі ў Мінску і змешчаны ў СІЗА КДБ. Яму прад'яўлена абвінавачанне ў арганізацыі і ўдзеле ў масавых беспарадках (чч. 1 і 2 арт. 293 КК), у знявазе прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК) і ў самавольным прысваенні звання або ўлады службовай асобы (арт. 382 КК). Класкоўскаму пагражае да 15 гадоў пазбаўлення волі.

Пасяджэнне суда па справе Аляксандра Класкоўскага адбудзецца 11 мая ў Ленінскім судзе Мінска.

З НАГОДЫ

# 100 ДЗЁН ПАСЛЯ ІНАЎГУРАЦЫІ

Вольга ХВОІН



**1 мая беларусы прайшлі стодзённы рубеж пасля чацвёртай па ліку інаўгурацыі Аляксандра Лукашэнкі. Беларусь з цэлым букетам эканамічных праблем, падзеннем рэйтынгу кіраўніка дзяржавы і ўзрастаннем незадаволенасці палітыкай улады ў шэрагах абывацеляў.**

Масавыя рэпрэсіі супраць іншадумцаў, раскручаны махавік судоў па справах аб падзеях 19 снежня 2010 года, чарговая пагроза закрыцця газет «Народная воля» і «Наша ніва» рухаюць Беларусь у бок не проста маргіналізацыі апазіцыі, але яе вынішчэння.

Ступар, як бы ад яго ні адхрышчвалася апазіцыя, мае месца. Традыцыйныя вулічныя вясеннія акцыі — Дзень Волі, Чарнобыльскі шлях, урэшце Першамай — прайшлі надзвычай сціпла, у абрэзаных фарматах (калі яшчэ так можна гаварыць пра акцыі ў выглядзе натоўпаў спецназу і купкі людзей з кветкамі пад помнікамі класікам беларускай літаратуры — Дзень Волі), нешматлюдна, з аглядкаю, без гучных заяў і сацыяльнага розгаласу. Можа падацца, што людзі задаволены дзейсным кіраўніцтвам і не падтрымліваюць апазіцыю. Але значна больш слушна шукаць карані ў страху. Тым славутым страху, пра які столькі год цвердзілі апазіцыйныя лідары і які апошнія месяцы шчыльна агарнуў беларускае грамадства.

Усяго чатыры месяцы. Але як змянілася адчуванне рэчаіснасці! Апазіцыянеры «на стрёме» ў чаканні чарговых вобшукаўарыштаў, абывацелі з насцярогай угледзяюцца ў суседзяў у аўтобусе, метро. Суды, арышты, выбух у метро, эканамічны абвал, Беларусь, паводле штогадовай справаздачы аб свабодзе прэсы праваабарончай арганізацыі Freedom House, уключаная ў дзясятку краін свету з найгоршым станам свабоды прэсы... Карціць задаць рытарычнае пытанне: «Куды ж коціцца стабільная, квітнеючая Беларусь?»

За першыя тры месяцы — студзень-сакавік, а тады сітуацыя яшчэ была куды больш мяккай, — электаральны рэйтынг Аляксандра Лукашэнкі знізіўся амаль на дзесяць пунктаў: з 53 да 42,9%. Такія дадзеныя прыводзяцца ў сацыялагічным даследаванні беларускага Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў, зарэгістраванага ў Літве. Было б цікава ўявіць сабе цяперашнюю Беларусь, напрыклад, у лістападзе мінулага года, за месяц да прэзідэнцкіх выбараў. Якія б лічбы атрымалі выбарчыя камісіі, калі і ў «застабільнай» падтрымка была не на ўзроўні ўсеагульнага «адабрамс».

Добры адміністратар і гаспадарнік Міхаіл Мясніковіч на пасадзе прэм'ер-міністра выглядае не надта пераканаўча, і пакуль на яго рахунку — праблемы з валютай, інвестыцыямі, інфляцыя, рост коштаў. «Пакуль што ўраду Мясніковіча нельга даць ніякай ацэнкі. А калі яе нельга даць за сто дзён, то ацэнка адмоўная, — гаворыць намеснік старшыні партыі АГП, бізнэсовец Леў Марголін. — Сітуацыю вы бачыце: яшчэ першыя 60 дзён — студзень-люты — усё трымалася, а ў сакавіку-красавіку ўсё пасыпалася. І больш таго, захады, што прымае ўрад і Нацбанк, нічога апроч смеху не выклікаюць, бо спачатку прымаецца адна заява, потым другая — дыяметральна супрацьлеглая. Гэта сведчыць, што стратэгіі няма — ёсць хаатычныя спробы неяк выратаваць сітуацыю, але так не робяць з краінай, з мільёнамі людзей».

Краіна ў ізаляцыі самой сябе. На Захадзе на Беларусь глядзяць як на хворага на чуму. Не спяшаецца кінуць выратавальны паплавок і прыяцель з Усходу, залежнасць ад якога дасягае крытычнага стану. Лукашэнка, відаць, разумеючы сэнс сітуацыі, зрываецца. І ўжо не на ўзроўні «адмарожанай» апазіцыі і «вашывых блох» прадпрымальнікаў, а на адрас кіраўніка Еўракамісіі і прэзідэнта Украіны гучаць абразлівыя выказванні. Падобна на сутаргавыя спробы захаваць сябе і свой статус, з патаемным страхам паразы.

ПРАГРАМА

# БЕЛАРУСЬ ПРАСОЎВАЕ Ў ЕЎРОПУ АГРАГАРАДКІ

Яўген БЯЛАСІН

**Беларускія службоўцы спрабуюць за межамі Беларусі даказаць, што сродкі на аграгарадкі выдаткаваныя не ўпустую.**




На адной з навуковых канферэнцый у Польшчы адбылася прэзентацыя «Новыя магчымасці развіцця сельскіх пасяленняў. Досвед стварэння аграгарадкоў». Аўтаркай прэзентацыі была Валянціна Назарук, начальнік галоўнага ўпраўлення праектных работ Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь. Тэкст прэзентацыі даступны ў інтэрнэце, аднак адзначым, што навіной падзяліўся адзін з уражаных польскіх удзельнікаў.

Спадарыня Назарук паведаміла, што ў Беларусі з 2005 па 2008 гады коштам трох трыльёнаў беларускіх рублёў 937 вёсак ператвораны ў аграгарадкі. Гэтыя інвестыцыі падаюцца як пазітыўны прыклад гаспадарання ва ўмовах змяншэння сельскага насельніцтва. Аграгарадкі акрэсліваюцца як «сельскія населеныя пункты новага тыпу». Было паведамлена, што ўжо распрацаваны і наступны этап праграмы да 2015 года.

Аўтар прэзентацыі падкрэслівае, што Праграма стварэння аграгарадкоў, распрацаваная на 2005–2010 гады, ініцыяваная прэзідэнтам. «Важная асаблівасць, што адрознівае праграму, гэта яе маштабнасць». Паводле яе, з улікам 44 стандартаў павінен быць пабудаваны 1481 аграгарадок.

Як узорны прэзентаваўся між іншымі аграгарадок Ноўка непадалёку ад Віцебска.

Я папрасіў даць прафесійны каментар наконт прэзентацыі Ірыну Лаўроўскую, доктара ўрбаністыкі і архітэктуры. Ірына Лаўроўская, вядомая сваімі даследаваннямі гісторыі развіцця архітэктурнай спадчыны Берасця, у 1974 годзе абараніла дыпломную працу па тэме аграпрамысловага комплексу для малдаўскай вёскі. Такі комплексны досвед у гісторыі горадабудаўніцтва, на мой погляд, дазваляе адмысловую бачыць нябачнае для другіх. І хіба не цікава будзе падглядзець у шчыліну частаколу, нагароджанага вакол аграгарадкоў?

— Ідэя аграгарадка не новая, — распавяла Ірына Лаўроўская. — Напрыканцы 1960-х — на пачатку 1970-х гадоў праходзіла меліярацыя няворыўных земляў, коштам ліквідацыі фальваркаў або т. зв. «неперспектыўных» вёсак узбуйняліся «перспектыўныя» вёскі. І тады, і зараз гэта абгрунтоўвалася патрэбай стрымлівання адтоку насельніцтва з вёскі. Непрывабнасць аграрных паселішчаў для моладзі тлумачылася ў тым ліку і адсутнасцю выгодаў водаправоду, ацяплення, каналізацыі. А ў выніку ад пачатку 1970-х да канца 1980-х была амаль цалкам знішчана аўтэнтыка палескіх краявідаў, што вельмі шкодзіць так прапагандуемай сёння агратурыстыцы. У сучасных праектах аграгарадкоў кідаецца ў вочы тая ж адсутнасць стратэгічнага планавання, — не біруць пад увагу патрэбы жыцця і развіцця грамадства. Гэта прыводзіць да механічнага праектавання жытла пры адсутнасці разумення ўзроўнаважанага развіцця тэрыторый, без грунтоўнага аналізу патэнцыйных магчымасцей і небяспекаў канкрэтных тэрыторый. Усё зводзіцца да слаўтага «дзяржаўнага інтарэсу», патрэбы і чаканні асобы застаюцца па-за ўвагай. Варта згадаць, што ў XVI стагоддзі з-за верагоднага аслаблення эканамічнага стану гарадоў у Еўропе прававаймі актамі абмяжоўвалася будаўніцтва новых паселішчаў. Наша шляхта тады праігнаравала небяспеку, маючы ўласныя амбіцыі ды неблагі эканамічны інтарэс з прыватных мястэчак. Будоўля некаторых аграгарадкоў (прыкладам, Ноўка, што пасаджаны ўсяго ў 4 кіламетрах ад райцэнтра) мне падаецца памылкай з таго самага шэрагу.

Мне як філолагу ключавым у гэтым выпадку падаецца паходжанне слова «горад». Нашы продкі калі што і агароджвалі, то толькі свае асабліва каштоўныя цывілізацыйныя здабыткі: храмы, тэатры, музеі, бібліятэкі, сядзібы самакіравання, ураду. У вясковых паселішчаў зусім іншыя функцыі, а мінусы не-горада, па-першае, абарочваюцца плюсамі блізкасці да прыроды, па-другое, нівелююцца сучаснымі сродкамі зносін, найперш аўтаномнымі (той жа веласіпед — чальцы брэсцкага велаклуба «Кола-бок», прыкладам, на сучасных веласіпедах за выхадныя плануюць і здзяйсняюць вандроўкі ў некалькі сотняў кіламетраў, і яны неўзабаве, спадзяемся, пашырацца і на Польшчу). У Германіі тэхнічны прагрэс даў магчымасць вяскоўцам мець камфорт гараджанаў, і нездарма маладыя сем'і імкнуцца жыць па-за гарадамі, хоць на працу некаторыя з іх даязджаюць у горад (так званыя «ківачы» — вакол Гамбурга іх лік, прыкладам, ідзе на дзясяткі тысяч).

Таму калі «агра», тады ўжо не «гарадок», і навошта гарадзіць плот там, дзе не трэба? Універсітэцкі гарадок — гэта зразумела, бо ўніверсітэты ў Еўропе заўсёды мелі аўтаномны статус. І нават савецкія ваенныя гарадкі зразумела, чаму гарадкі. А агра… — прабачце — гарадкі, гэта спараджэнне славалюбства і некампетэнтнасці. Мне асабіста, калі еду міма гэтых аднолькавых дамкоў па трасе рэспубліканскага або міжнароднага значэння, прыходзяць на розум домікі аршыткоў у рэчцы, лічынак матылькоў — яны спрэс аднолькавыя, ніякай індывідуальнасці, і пра якія б стандарты ні гаварылася, але для чалавека, па-мойму, стандарт індывідуальнасці якраз адзін з самых важных. Па-другое, думаеш пра аматараў хуткіх рашэнняў у Кітаі часоў культурнай рэвалюцыі, якія азадачылі кітайцаў доменнымі печкамі на кожным вясковым падворку і саматужна плавілі метал, які пякуць лаваш у земляных бачкаватых каменных печах…

Рабіць нешта, каб потым перарабляць — гэта марнаванне грошай. Вынік неабгаворaных, валюнтарысцкіх рашэнняў заўсёды будзе абвергнуты жыццём. І ў выпадку аграгарадкоў гэта ўжо адбываецца. Некаторыя аграгарадкі папросту не засяляюцца. Прыкладам, як паведаміла газета «Брестский курьер», у Жабінкаўскім раёне пустуюць дамы ў аграгарадку Надежда-агро. Гаспадарка збанкрутавала і далучаная да суседняй аграфірмы «Мацівевічы».

Так званыя аграгарадкі нараўне з жыццяздольныя найперш з-за нізкай эфектыўнасці працы пралетарыяў ад зямлі. Так, паводле статыстыкі, з дзяржаўных прадпрыемстваў найбольш датаванымі з'яўляюцца менавіта прадпрыемствы агракомплекса, а зваротнасць пазыкаў не дасягае 20 працэнтаў — яны папросту спісваюцца.

ТРЭЦІ СЕКТАР

# УЛАДЗІМІР МАЦКЕВІЧ

Аляксандр ТАМКОВІЧ

**Ва ўмовах, калі дзясяткі іншадумцаў знаходзяцца за кратамі, прапаноўваць нейкія перамовы з удзелам уладаў можа толькі альбо палітычны самазабойца, альбо «засланы казачок». Ні першым, ні другім Уладзімір Мацкевіч не з'яўляецца па вызначэнню, але ж прапануе. І яго прапановы, калі паспрабаваць іх зразумець, ужо не здаюцца абсалютным «нонсэнсам».**



## Супраць цячэння

Ведаю, што стаўленне да гэтага чалавека неадназначанае, і гэтаму ёсць пэўныя тлумачэнні. Пасля сумных падзей 19 снежня 2010 года ў розныя пастарункі трапілі сотні людзей, а выбух 11 красавіка 2011 не толькі «взорвал стабильность», але і надзею на нейкія нармальныя кантакты з уладай. Тым больш, што гэтыя кантакты ёй патрэбны не больш, чым (паводле У. Высоцкага) лыжы ў рускай лазні. Мацкевіч гэта добра разумее, адсюль галоўная думка ягонай канцэпцыі — прымусіць уладу пайсці на дыялог. Але тут ужо многія не разумеюць яго, бо немагчыма ўявіць, як гэта рэалізаваць у нашых умовах. І таму большасць аддае перавагу байкоту.

Не хочацца займаць у гэтых дыскусіях чыйсьці канкрэтны бок, але яшчэ з дзяцінства памятаю прыказку: «Хто як празываецца, так і называецца». Байкот не азначае канапнага гультайства і не з'яўляецца сінонімам паняцця «няўдзел». Калі рабіць усё па-сапраўднаму, то байкот здзейсніць цяжэй, чым абазначыць свой удзел у выбарах.

Па вялікаму рахунку, прапановы Уладзіміра Мацкевіча суадносяцца з «канцэпцыяй байкоту». У тым сэнсе, што эфектыўны рух наперад (альбо яго адсутнасць) магчымы толькі тады, калі за ім стаіць нешта моцнае, бо размаўляюць і лічацца з тымі, за кім ёсць моц.

Канешне, як і многім, ідэя байкоту падаецца больш лагічнай, але я разумею, што для канчатковага поспеху патрэбныя не толькі эмоцыі. Неабходна пэўная доля прагматычнасці. На жаль, сёння ў ідэйных апанентаў улады яна ў відавочным дэфіцыце, а імкненне выдаць жаданае за існае ў іх не меншае, чым у тых, хто спявае пра айчыны эканамічны цуд.

Магчыма, гэта спрэчна, але, на мой погляд, рэжым сёння наўмысна робіць так, каб спраўкаваць да сябе адмоўнае стаўленне. І такім чынам цалкам пагасіць у шэрагах апазіцыі любыя памкненні да кантактаў з уладай. З астатнімі ж, з «шырокімі масамі», спадзяюцца, усё будзе «як заўсёды». Менавіта гэта статус-кво ўжо 17 гадоў адным дазваляе «кіраваць», а другім — змагацца са «злачынным рэжымам».

Пры гэтым прашу заўважыць, ніхто з іх на дух не пераносіць якой-небудзь канкурэнцыі. Палітычныя канкурэнты альбо «знікаюць», альбо абвяшчаюцца «рукой Крамля».

Не палічыце езуіцтвам, але асабіста мне было б прыемна назіраць, каб уладны бок пайшоў на перамовы з тымі, каго яшчэ ўчора называў «пятай калонай» і «адмарозкамі». Немагчыма? Як сказаць. У гэтым жыцці магчыма ўсё, бо пакуль «стабільныя» толькі чэргі каля абменнікаў і штодзённы рост коштаў у крамах.

І яшчэ. Як і многім, мне вельмі надакучыла назіраць, як апазіцыянеры «бадаюцца» паміж сабой. Прастаму выбаршчыку з Мінска, Магілёва, Ашмян, Смаргоні, Быхава, з вёскі Навасёлкі ды іншых глыбока «да лямпачкі» нейкія палітычныя спрэчкі. Ён стаміўся і прагне пераменаў. Менавіта — пераменаў, канкрэтных дзеянняў, а не размоў пра іх.

## Першыя хвалі

Ну а цяпер, як вы ўжо здагаліся, пералічу звычайныя для такіх нарысаў біяграфічныя звесткі Уладзіміра Мацкевіча. Нарадзіўся ён у горадзе Чарамхова Іркуцкай вобласці 14 мая 1956 года. Туды саслалі яго бацькоў і дзядоў. Бацька Уладзімір Дзем'янавіч і маці Лідзія Карпаўна пабраліся шлюбам за тры гады да дня народзінаў будучага метадолага.

Дарэчы, яны пазнаёміліся ўжо там, у мясцовай беларускай суполцы. Паселішча Чарамхова існуе з канца XVI стагоддзя, але з часам невялікі шахцёрскі пасёлак ператварыўся ў перспектыўны геаграфічны пункт. Для дабывання «адкрытым спосабам» была патрэбнай танная працоўная сіла. У сталінскія часы праблема вырашалася проста і хутка — ссыльныя. Былі сярод іх і два эшалона беларусаў.

У 1966 годзе сям'я Мацкевічаў вярнулася ў Беларусь, у Гродна. Амаль сем гадоў «мыкаліся» па розных інтэрнатах і здымных кватэрах. Уласную атрымалі толькі тады, калі Валодзя перайшоў у дзясяты клас.

У 1973 годзе хлопец паспрабаваў паступіць на факультэт псіхалогіі Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта (ЛДУ), але без станоўчага выніку. Чаму такі сур'ёзны выбар? Абумоўлены ён быў падлеткавай грамадска-палітычнай актыўнасцю.

У старэйшых класах Уладзімір Мацкевіч быў хіпі і нават прымаў удзел у знакамітай гродзенскай дэманстрацыі 1972 года. Але ў катэгорыю «нядобранадзейных» трапіў не за гэта. Прычынай стала школьная экскурсія ў Брэсцкую крэпасць. Справа ў тым, што першы раз ён быў там раней і «лубочную» рэстаўрацыю не прыняў, пра што шчыра і напісаў у сваім сачыненні.

Пры Сталіне за такое б маглі расстраляць, а тут усё абмяжавалася звычайным «вон са школы». Бальшавіцкую пільнасць праявіла класны кіраўнік, якая абвінавачала школьніка ў «антысавецтчыне». На бок Мацкевіча паўстаў увесь клас, але адстаяла яго маці, якая са слязамі на вачах «пайшла па інстанцыях».

У гэты ж час пачалася так званая «дапрызыўная камісія». Калі там прачыталі характарыстыку Уладзіміра Мацкевіча, адразу пацягнулі хлопца да псіхіятра. Так ён упершыню пазнаёміўся з людзьмі прафесіі, якую потым абярэ і сам. І да якой свядома рыхтаваўся, прачытаўшы ў мясцовай бібліятэцы амаль усе кніжкі па псіхалогіі, што там былі. Гэтыя кніжкі і сталіся для яго ці не першай крыніцай іншадумства.

## Крыніцы іншадумства

Пасля няўдалай спробы паступлення Уладзімір Мацкевіч быў прызваны ў армію. Рыхтавалі маладога салдата на спецыяліста па рамонту і захаванню радыёлакацыйных станцый наземнай артылерыі. Пазней, праўда, высветлілася, што вучылі яго рамантаваць станцыі, якія ўжо знятыя з узбраення. Тут ён яшчэ раз пераканаўся, што без ведаў у галіне псіхалогіі ў нашым жыцці разабрацца вельмі цяжка.

Потым было падрыхтоўчае аддзяленне і статус студэнта ЛДУ. Падчас вучобы і ажаніўся. У гэты ж час нарадзіўся старэйшы сын Тамаш. Такое імя Уладзімір Мацкевіч падабраў наўмысна — каб не было «рускіх» аналагаў. Беларускую транскрыпцыю ў пашпарце, хаця і з цяжкасцю, усё ж такі «адваяваў».

Атрымаўшы дыплом спецыяліста па інжынернай псіхалогіі («чыстай» навукай заняцца не далі), Уладзімір Мацкевіч трапіў у бюро тэхнічнай эстэтыкі Віленскага радыётэхнічнага завода. Праз восем месяцаў высветлілася, што «допуск» для працы на «ваенным» заводзе яму не дадуць. Дысідэнцкія «выбрыкі» юнацтва КДБ не даравала, і Мацкевіч вярнуўся назад у Ленінград.

Сем месяцаў быў беспрацоўным, а потым яго ўзялі на гуманітарную кафедру Ленінградскага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту. Вучыў будучых дыспетчараў метрапалітэну і даволі хутка ўзначаліў адну з даследчых лабараторыяў.

Там жа скончыў працу над дысертацыяй, але абараніць яе не змог, бо для гэтага трэба было ўступіць у партыю. Адмовіўся. Потым цалкам захапіўся адукацыйнымі праблемамі і нават падрыхтаваў новую дысертацыю. Яе абараніць таксама не ўдалося.

У 1985 годзе пачалася перабудова. Яе віры захапілі і Уладзіміра Мацкевіча. Распавядаць усе падрабязнасці не буду, скажу толькі, што менавіта тады ён і пачаў займацца метадалогіяй.

У 1993 годзе лёс зноў вярнуў яго ў Беларусь.

## На хвалі логікі

Мацкевіч крыху папрацаваў у камандзе Шушкевіча. У маі 1994 года разам з аднадумцамі стварыў Агенцтва гуманітарных тэхналогій, якое ён узначальвае і сёння. Амаль адразу з'явіліся іх першыя аналітычныя публікацыі.

Былі ў яго біяграфіі і «тэлевізійныя» старонкі. Падрабязнасці пакінем «за дужкамі», скажу толькі, што яму першаму прапанавалі стаць вядучым перадачы «Рэзананс», якая толькі стваралася. Нават касцюм пашылі. Кандытару «зарубілі» Замяталін з Латыпавым, якія ведалі кнігі Мацкевіча, ведалі і пра яго ўдзел у стварэнні Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП). Ну і, зразумела, яго асоба ніякім чынам не ўспрымалася сумна вядомым Аляксандра Зімоўскім.

Справядліва заўважана, што чым больш мінае часу з моманту падзеі, тым больш аб'яўляецца ў яе «хросных бацькаў». Ідэя стварэння новай, ліберальнага кірунку палітычнай партыі нарадзілася адразу ў некалькіх людзей. Уладзімір Мацкевіч — адзін з іх.

Менавіта ён (пад выглядам інтэрв'ю) размаўляў са Станіславам Багданкевічам, які на той момант узначальваў Нацыянальны банк Беларусі, а калі 1 кастрычніка 1995 года з'явілася Аб'яднаная грамадзянская партыя, увайшоў у склад першага Нацыянальнага камітэта і нават некаторы час узначальваў іх прэс-цэнтр.

Меў ён і непасрэднае дачыненне да «Хартыі–97», якая ўзнікала як новы элемент грамадзянскай супольнасці, бо задумвалася шырокім грамадзянскім рухам. Спачатку Мацкевіч пазнаёміўся і нават пасябраваў з Андрэем Саннікавым. А потым да іх далучыліся Пётр Марцаў, Зміцер Бандарэнка і Віктар Івашкевіч. Уладзімір Мацкевіч сфармуляваў яе асноўныя ідэі, напісаў тэкст заявы, пад якой і паставіла свае подпісы першая сотня дэмакратычных актывістаў. Так вясной 1997 года пачалася праца па стварэнню добра вядомай сёння структуры, якая ў шырокі рух, па розных аб'ектыўных і суб'ектыўных прычынах, так і не перарасла.

Апошнія гады Уладзімір Мацкевіч займаецца пераважна праблемамі грамадзянскай супольнасці — «трэцяга сектара». Нагадаю: «першы сектар» — гэта дзяржаўныя структуры, «другі» — тыя, хто займаецца бізнесам.

Днямі ўбачыў у інтэрнэце адзін вельмі цікавы тэзіс — «трэці сектар» сёння фармуецца ля пунктаў абмену і продажы валюты. Магчыма, камусьці ён падасца спрэчным, але менавіта ў гэтай «стыхійнасці», ініцыятывах ад звычайных людзей, актыўнасці знізу і ёсць галоўны сэнс самога тэрміна. Сапраўдны «трэці сектар» узнікае толькі тады, калі першыя два (дзяржава і бізнэс) не імкнуцца яго «падмяць».

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 11 ТРАЎНЯ, СЕРАДА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.30** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 00.35** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Сфера інтэрасаў». Эканамічная праграма.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** «Ведай нашых».
**12.10** «Не прыспешвай каханне». Лірычная камедыя (Украіна).
**14.10** «OFF STAGE LIFE».
**14.25** Інфармацыйна-забаўляльная праграма «Праверка чутак».
**15.15, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** Меладраматычны серыял «Выйшаў вожык са смугі» (Расія). 2-я серыя.
**16.35** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.30** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.30** Зямельнае пытанне.
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**20.30** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.10** Хакей. Чэмпіянат свету. 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**23.40** «Доктар Хаўс-4». Серыял. 1-я серыя.
**00.45** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Фільм «Аэліта, не прыставай да мужчын».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Жаночыя мары пра далёкія краіны». Шматсерыйны фільм.
**22.15** Фільм «Чорная котка, белы кот».
**00.30** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.25** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дашнікі». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Сапраўдная гісторыя».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Серыял.
**14.40** «Рэдакцыя». Серыял.
**15.30** «Паляванне на ізюбра». Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Дашнікі». Серыял.
**21.30** «Мінск і мінчане».
**22.05** «Дабро пажалiцца».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Паляванне на ізюбра». Серыял.
**00.00** «Водблiскі». Серыял.

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.40** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.40** Прыгодніцкі баявік «Снайпер. Зброя адплаты» (Беларусь-Расія). 1-я серыя.
**10.40** Спорт-кадр.
**11.05** Авертайм.
**11.35** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.20** Медычныя таямніцы.
**12.55** Медычныя таямніцы +.
**13.10** Жансавет.
**13.45** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.50** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**15.55** Пазакласная гадзіна.
**16.10** Серыял «Ты маё жыццё».
**17.10** Хакей. Чэмпіянат свету. 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**19.35** Прыгодніцкі баявік «Снайпер. Зброя адплаты» (Беларусь-Расія). 2-я серыя.
**20.35** Калыханка.
**20.55** Тэлебарометр.
**21.00** Беларуская часіна.
**22.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.40** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.15** Рэальны свет.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** Прэм'ера. «Прамы эфір».
**10.10** «Паміж драмай і камедыяй. Ян Арлазораў». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Учора скончылася вайна».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Учора скончылася вайна».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** Прэм'ера. «Чырвоная Месаліна. Дэкрэт аб сэксе». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Вочная стаўка».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**10.20** «Кватэрнае пытанне».
**11.20** «Жаночы погляд».
**12.05** «Да суду».
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Дзяржаўная абарона».
**23.40** «Сапраўдны італьянец». Дакументальны праект.
**00.30** «Асабліва небяспечны!».

### EUROSPORT

**09.30** Алімпійскі часопіс.
**10.00** Веласпорт. Джыро д'Італія. 4-ы этап.
**11.00** Тэніс. WTA. Рым. Дзень 2-і.
**12.00** Тэніс. WTA. Рым. Дзень 3-і.
**15.45** Веласпорт. Джыро д'Італія. 5-ы этап.
**18.30** Тэніс. WTA. Рым. Дзень 3-і.
**20.30** Тэніс. WTA. Рым. Дзень 3-і.
**22.10** Спартовае вандраванне. Часопіс.
**22.20** Конны спорт. Выездка.
**23.20** Конны спорт. Часопіс.
**23.25** Гольф. US. PGA. Fargo Championship.
**00.25** Гольф. Адкрыты чэмпіянат Іспаніі.
**00.55** Гольф клуб. Часопіс.
**01.00** Яхт-клуб. Часопіс.
**01.15** Настольны тэніс. Чэмпіянат свету. Ратэрдам. Дзень 4-ы.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30** «Фальшыўманетнікі. Вяртанне «Згаі», серыял: 5 серыя.
**08.20** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 36 серыя.
**09.15** «Эміль з Лёнэбэр'і», серыял: 7 серыя.
**09.35** Праект «Будучыня».
**10.05** Рэпартэр.
**10.30** Навігатар.
**10.45** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**11.00** Два на два (тэледыскусія): Уладзімір Мацкевіч і Леў Марголін.
**11.25** Асабісты капітал.
**11.40** Вагон.
**11.50** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Фальшыўманетнікі. Вяртанне «Згаі», серыял: 5 серыя.
**12.50** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 36 серыя.
**13.45** «Эміль з Лёнэбэр'і», серыял: 7 серыя.
**14.05** Праект «Будучыня».
**14.35** Рэпартэр.
**15.00** Навігатар.
**15.15** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**15.30** Два на два (тэледыскусія): Уладзімір Мацкевіч і Леў Марголін.
**16.00** Асабісты капітал.
**16.15** Вагон.
**16.20** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**16.30** Басанож па свеце.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Эміль з Лёнэбэр'і», серыял: 8 серыя.
**17.30** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 5 серыя.
**18.20** Беларусы ў Польшчы.
**18.35** Эксперт.
**19.00** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.10** Сальда (эканамічная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** На колах.
**20.20** Навігатар.
**20.35** Вагон.
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Без рэтушы: «Алкаш», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**21.45** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**22.10** «Дэкалог, чатыры», маст. фільм, 1990 г., Польшча.
**23.10** Аб'ектыў.
**23.30** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).

## 12 ТРАЎНЯ, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50** Зона Х.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10-15.00** Тэхнічная прафілактыка.
**15.20, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** Патрабуецца.
**15.50** Меладраматычны серыял «Выйшаў вожык са смугі» (Расія). 3-я серыя.
**16.50** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Меладраматычны серыял «Маруся. Вяртанне» (Украіна).
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.30** Клуб рэдактараў.
**22.00** Конкурс песні «Еўрабачанне-2011». Другі паўфінал. Прамая трансляцыя з Дзюсельдорфа (Германія).
**00.00** «Доктар Хаўс-4». Драматычны серыял (ЗША). 2-я серыя.
**00.55** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Фільм «Час жаданняў».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Жаночыя мары пра далёкія краіны». Шматсерыйны фільм.
**22.15** Прэм'ера АНТ: «Хто там?». Аналітычная праграма.
**22.45** Фільм «16 кварталаў».
**00.35** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.30** Начныя навіны.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дабро пажалiцца».
Прафілактыка з 09.00 да 15.00.
**15.00** «Вялікі горад».
**15.30** «Паляванне на ізюбра». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Дашнікі». Серыял.
**21.30** «Праўда».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Паляванне на ізюбра». Серыял. Заключная серыя.
**00.00** «Водблiскі». Серыял. Заключная серыя.

**06.35** Моладзевы камедыйны серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргентына).
**09.00-14.50** Тэхнічная прафілактыка.
**14.55** Пазакласная гадзіна.
**15.10** Прыгодніцкі баявік «Снайпер. Зброя адплаты» (Беларусь-Расія). 2-я серыя.
**16.10** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргентына).
**17.10** Хакей. Чэмпіянат свету. 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**19.35** Прыгодніцкі баявік «Снайпер. Зброя адплаты» (Беларусь-Расія). 3-я серыя.
**20.45** Калыханка.
**21.05** Тэлебарометр.
**21.10** Хакей. Чэмпіянат свету. 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**23.30** Час футболу.
**00.00** Моладзевы камедыйны серыял «Універ» (Расія).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** Прэм'ера. «Прамы эфір».
**10.10** «Геніяльны пустэльнік. Вечная музыка Шварца». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Учора скончылася вайна».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія, 2010 г.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Учора скончылася вайна».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50-00.45** «Паядынак».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
Прафілактыка з 08.30 да 15.10.
**15.10** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Дзяржаўная абарона».
**23.15** Сёння.
**23.40** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**00.30** «Асабліва небяспечны!».

### EUROSPORT

**09.30** Веласпорт. Джыро д'Італія. 5-ы этап.
**11.00** Тэніс. WTA. Рым. Дзень 3-і.
**12.00** Тэніс. WTA. Рым. Дзень 4-ы.
**14.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Юніёры. Групавы этап (Сербія).
**15.45** Веласпорт. Джиро д»Італія. 6-ы этап.
**18.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Юніёры. Групавы этап (Сербія).
**20.00** Тэніс.
**20.30** Тэніс. WTA. Рым. Дзень 4-ы.
**00.00** Восъ дык так!!!
**00.15** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**00.50** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.45** Ралі. Корсіка. Дзень 1-ы.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**07.30** «Дэкалог, чатыры», маст. фільм, 1990 г., Польшча.
**08.30** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма).
**08.40** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**08.45** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 5 серыя.
**09.30** «Эміль з Лёнэбэр'і», серыял: 8 серыя.
**09.55** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**10.25** Беларусы ў Польшчы.
**10.40** Сальда (эканамічная праграма).
**10.55** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**11.20** Без рэтушы: «Алкаш», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**11.45** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Дэкалог, чатыры», маст. фільм, 1990 г., Польшча.
**13.00** Невядомая Беларусь: «Гульня ў вайнушку», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**13.45** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 5 серыя.
**14.30** «Эміль з Лёнэбэр'і», серыял: 8 серыя.
**14.55** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**15.20** Беларусы ў Польшчы.
**15.40** Сальда (эканамічная праграма).
**15.55** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**16.20** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма).
**16.30** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Школа на санцапёку», серыял: 23 серыя.
**17.30** «На мяжы нормы», маст. фільм, 2000 г., ЗША.
**19.05** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.15** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Невядомая Беларусь: «Лінія Сталіна. Гонар ці ганьба?», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.50** Форум (ток-шоў).
**22.35** «Пуаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 5 серыя.
**23.25** Аб'ектыў.
**23.45** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).

ЦІКАВА

# КРАХ АДНОЙ РЭСПУБЛІКІ

Алег НОВІКАЎ

**У ноч на 1 студзеня 2012 года пад бой навагодніх курантаў Венгерская Рэспубліка ператворыцца ў проста Венгрыю. Усё з-за прынятай у красавіку новай рэдакцыі канстытуцыі.**




Акрамя таго, што венгры далі свету кубік Рубіка і салямі, яны паставілі незвычайны рэкорд: больш за 60 гадоў (1949–2011) гэты народ фармальна жыў па сталінскай канстытуцыі. Нават у СССР жалі менш: прынятую ў 1936 годзе сталінскую рэдакцыю канстытуцыі ў 1977-м замянілі брэжнеўскай.

Хаця, калі глядзець на гісторыю венгерскага права, магчыма, гэта і лагічна. Нават пісанага грамадзянскага права тут не было. Усё трымалася на так званым звычаёвым праве. Што тычыцца канстытуцыі, то першыя крокі былі зробленыя падчас рэвалюцыі 1848 года, калі рэвалюцыйны ўрад выдаў шэраг дэкрэтаў.

Статут 1867-га пра падзел Габсбургскай манархіі на Аўстрыю і Венгрыю заклаў асноўныя прынцыпы венгерскай аўтаноміі і самакіравання. А першую венгерскую канстытуцыю прыдумалі камуністы пасля паўстання 1919 года. Імі была прынята канстытуцыя Венгерскай Рэспублікі Саветаў. Яна, праўда, дзейнічала толькі два месяцы — менавіта столькі існавала рэспубліка.

Новы рэжым адмірала Хорці правіў без усякіх асноўных законаў. Іх замянялі Статуты. Так венгры дажылі да 1946 года, калі на руінах дзяржавы Хорці была прынятая Малая або Пераходная канстытуцыя, якая абвяшчала канец манархіі і перадавала ўсю ўладу ў рукі парламенту, які мусіў прыняць поўны варыянт канстытуцыі.

Першыя два абраныя пасля вайны парламенты, у якіх мелі перавагу дэмакраты, зрабіць гэта не паспелі. Затое рукі да канстытуцыі дайшлі ў дэпутатаў трэцяга парламента, у якім дамінавалі дэпутаты прамаскоўскай Венгерскай партыі працоўных. Так была прынята згаданая вышэй канстытуцыя, тэкст якой, па вялікім рахунку, папросту перапісалі з савецкай канстытуцыі 1936 года.

Пасля падзення камунізму ў 1989 годзе былі заклікі напісаць новы асноўны закон, аднак апазіцыя і ўлада палічылі, што неабходны на пераходным этапе грамадзянскі кампраміс трэба будаваць на аснове закону 1949-га. З яго папросту прыбралі ўсе архаізмы савецкіх часоў і замянілі новымі пунктамі.

У 1990-я гады працэс аптымізацыі асноўнага закона працягваўся. Так, папраўка 1997 года дазволіла Венгрыі атрымаць сяброўства ў ЕС. У тым жа годзе было прынята рашэнне пра стварэнне новай канстытуцыі.

Да практыкі, аднак, справа дайшла толькі ў 2010 годзе, калі па ініцыятыве правацэнтрысцкай партыі «Фідэш» (Fidesz), якая па выніках выбараў атрымала абсалютную большасць у парламенце, была створана спецыяльная камісія.

З самага пачатку ідэя стварэння новай канстытуцыі выклікала пратэсты з боку левай апазіцыі. Сацыялісты і Зялёныя заявілі пра байкот працы камісіі. Аднак праца над канстытуцыяй працягвалася, і ўвесну яна была вынесена на разгляд публікі і парламенту. За кошт таго, што «Фідэш» кантралюе парламент, разгляд праекту не зацягнуўся. 18 красавіка праект канстытуцыі зацвердзілі ў парламенце, а 25-га — ён быў падпісаны прэзідэнтам Палам Шмітам. Гэта значыць, што з 1 студзеня 2012 года Венгрыя стане жыць па новым асноўным законе.

Паводле афіцыйнай рыторыкі, прыняцце новага асноўнага закона стала «разрывам з камуністычным мінулым» і «заканчэннем пераходу да сапраўднай дэмакратыі».

Аднак ёсць іншы погляд. Намеры «Фідэш» прыняць канстытуцыю з самага пачатку не ўзрадавалі праваабаронцаў і Брусэль. Партыя Віктара Орбана (лідар «Фідэш») мае падмочаную рэпутацыю, калі гаворка ідзе пра грамадзянскія правы. Дастаткова згадаць пра гучны скандал вакол прапанаванага «Фідэш» праекту закона аб СМІ, які надаваў права ўраду праз адпаведны орган кантраляваць рэдакцыйную палітыку выданняў. З канстытуцыяй атрымалася тое ж самае. Яе прыймалі пад раскаты дыпламатычнай вайны з Брусэлем і праваабаронцамі з розных арганізацый, кшталту «Amnesty International». Далучылася і ААН. Генеральны сакратар ААН выказаў занепакоенасць тым, што новы асноўны закон можа супярэчыць агульнапрынятым стандартам дэмакратыі.

Што канкрэтна не падабаецца крытыкам новай венгерскай канстытуцыі?

Сам дакумент — тэкст на 36 старонак, які складаецца з 53 артыкулаў і вялікай прэамбулы. Менавіта змест прэамбулы выклікаў каскад заўваг. На думку апанентаў, тут занадта шмат згадваецца пра бога, хрысціянства, сямейную мараль, гістарычнае права венграў на карпацкі басейн і г.д. Такая канстытуцыя, на думку шмат каго, хутчэй сугучная законам даўно зніклай каталіцкай Аўстра-Венгерскай імперыі, чым нормам большасці краін Еўрасаюза.

Фемініcткі ўхапіліся за артыкул, які патрабуе ад дзяржавы абараняць жыццё. Фішка ў тым, што жыццё, па канстытуцыі, пачынаецца пасля акту зачацця. Фактычна гэты артыкул канстытуцыі ўводзіць забарону на аборты. Не падабаецца аматарам гендэрных свабодаў і тое, што шлюб пазначаны ў канстытуцыі як саюз мужчыны і жанчыны. Такім чынам, як лічаць крытыкі дакумента, узнікае глеба для дыскрымінацыі сэксуальных меншасцяў.

Занадта нацыяналістычнай лічаць і назву краіны. Справа ў тым, што менавіта так краіна звалася ў перыяд паміж дзвюма сусветнымі войнамі, калі яна разлічвала вярнуць аднятыя пасля распаду Аўстра-Венгрыі землі, населеныя этнічнымі мадзьярамі. Цяпер каля трацiны ўсіх венграў жывуць за межамі краіны: у Румыніі, Славакіі, Сербіі, Украіне. Урады згаданых дзяржаў разглядаюць рост рэваншысцкіх настрояў у Будапешце як пагрозу цэласнасці сваіх тэрыторый.

Змяняюцца на карысць правых і механізмы заканатворчасці. З гэтага часу прыняцце законаў, якія рэгламентуюць дзейнасць Цэнтрабанка, а таксама пенсійнай і падатковай сістэм, павінны прымацца кваліфікаванай большасцю ў дзве трэці галасоў. Улічваючы, што дагэтуль левыя ніколі столькі мандатаў не мелі, і наўрад ці атрымаюць, гэта норма, па сутнасці, накіравана на кансервацыю рэформаў, якія праводзіць зараз кабінет Орбана.

Юрысты кажуць, што новая канстытуцыя парушае баланс галінаў улады. Паводле канстытуцыі, у Венгрыі з'явіцца новы дзяржаўны орган, які будзе сачыць за дзейнасцю правасуддзя.

Фактычна блакуецца далейшая эканамічная і фінансавая інтэграцыя Венгрыі ў ЕС. У адпаведнасці з новымі правіламі, для ўступлення краіны ў еўразону патрэбна дзве трэці галасоў парламента. Гэта норма ўжо выклікала трывогу сярод бізнэсменаў.

Супярэчлівая канстытуцыя, рэалізацыя якой на практыцы яўна пагражае ростам грамадскіх канфліктаў, можа адыграць і станоўчую ролю. Яна з'яўляецца жывой ілюстрацыяй таго, што можа прынесці еўрапейцам правы папулізм, які зараз набірае абароты.

Напрыканцы ў якасці кур'ёзу можна згадаць пункт, які не прайшоў у канчатковы варыянт. Прапанавалася, каб бацькі мелі права галасаваць не толькі за сябе, але і за сваіх непаўналетніх дзяцей, аднак тут супраць былі нацыяналісты, якія нагадалі, што сярод шматдзетных сем'яў шмат цыганскіх. У такім выпадку ў партый, якія абараняюць правы цыганскай меншасці, магла б вырасці палітычная вага.



## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Па меркаванні экспертаў, такія рэзкія заявы палітыкаў (словы А. Лукашэнкі на адрас кіраўніцтва ЕС і Украіны) пагражаюць перарасці ў гандлёвую вайну паміж нашымі краінамі. Могуць быць якія-небудзь дробныя брыдасці з боку Беларусі, накшталт забароны на ўвоз якога-небудзь тавару да іх ці да нас.

**«Вечерние Вести» (Украіна)**

Еўрапейскі Саюз на пачатку прэзідэнцкіх выбараў паабяцаў даць 3 мільярда еўра. Але пасля выбараў Лукашэнка жорстка здушыў пратэстны рух — і зараз ЕС і не думае аказваць яму фінансавую падтрымку. Застаецца Расія. У яе Лукашэнка просіць 3 мільярда долараў. Масква гатовая даць грошы пры ўмове, што Беларусь прыватызуе дзяржпрадпрыемствы, прычым самыя прыбытковыя з іх яна ахвотна прыбрала б сабе. З прычыны жудаснай эканамічнай сітуацыі Масква мае магчымасць усё больш збіваць кошты на жаданыя прадпрыемствы. Лукашэнка пачынае разумець, што сваім аддаленнем ад Захаду ён вырак сябе на тое, каб выконваць умовы Крамля.

**«Die Welt» (Германія)**

Беларускую ўладу раз'юшвае, што хтосьці можа адкрыта казаць пра віну прэзідэнта Лукашэнкі, які сваімі бясконцымі рэпрэсіямі выклікае ў беларускім грамадстве атмасферу нянавісці і страху. Замест выкаранення прычын гэтай нянавісці ўлады толькі падліваюць смалы ў агонь і, як заўсёды, бачаць у журналістах чыннік усіх бед. Здаецца, у савецкай гісторыі мы і да Лукашэнкі з гэтай стылістыкай сустракаліся.

**«Огонек» (Расія)**

Пра сур'ёзнасць намераў улады пасадзіць палітычных супернікаў на рэальныя тэрміны сведчаць папярэднія прысуды. На думку экспертаў, ніякіх істотных доказаў віны падчас судоў прад'яўлена не было. Сітуацыя, якая склалася ў Беларусі, ужо нікога не дзівіць. Аляксандр Лукашэнка нават не спрабуе прытрымлівацца прыстойнасці і выконваць законы, прычым не толькі ва ўнутранай палітыцы, але і ў знешняй.

**«Независимая газета» (Расія)**

Масква, карыстаючыся спрыяльным становішчам, пры дапамозе фінансавых уліванняў спрабуе дамагчыся «рэальнай інтэграцыі». Так, напрыклад, Масква прапанавала беларусам зрабіць нацыянальнай валютай расійскі рубель, праўда, без эмісійнага цэнтра ў Мінску. Аднак цяжка паверыць, што перспектыва эканамічнага і палітычнага ўключэння Беларусі ў склад Расіі падштурхне большасць беларусаў да супраціву мінскаму рэжыму.

**«Frankfurter Allgemeine Zeitung» (Германія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ГРУЗІЯ. ТАПАНІМІЧНАЯ ВАЙНА БЫЛЫХ СЯБРОЎ

Грузінскія медыя пішуць пра нечаканую напружанасць адносін уладаў Паўднёвай Асецыі і Расіі. Пра гэта, на іх думку, сведчыць тапаніміка. Справа ў тым, што ў Цхінвалі ўпарта называюць сваю дзяржаўную фармацыю Рэспубліка Ірыстон — так назвалі край пасля рэферэндуму пра выхад са складу Грузіі ў пачатку 1990-х. У сваю чаргу, у Маскве ўпарта падкрэсліваюць, што Цхінвалі — сталіца Паўднёвай Асецінскай Рэспублікі. На думку грузінскіх палітолагаў, вайна за назву мае вялікі сімвалічны характар. Захоўваючы назву Паўднёвая Асецыя, Крэмль стварае падставу для магчымага ўключэння рэгіёну ў склад Расіі пад соусам аб'яднання ўсіх асецінаў. Ірыстон так проста ўключыць у Расію не ўдасца. Давядзецца даводзіць усяму свету, што ніякіх ірыстонцаў як асобнай суверэннай нацыі не існуе. Наколькі маюць рацыю грузінскія палітолагі, цяжка сказаць. Амаль уся вертыкаль у Паўднёвай Асецыі — прысланыя Масквой расійскія грамадзяне.

**По матэрыялах «Эхо Кавказа»**

### КАЗАХСТАН. КАЗАХСКУЮ МОВУ ПЕРАВЯДУЦЬ НА ЛАЦІНКУ

Такі прагноз выдаў Бурыхан Нурмухамедаў, намеснік старшыні партыі «Ак Жол» (галоўная афіцыйная партыя ў Казахстане). Нагадаем, што казахі пісалі на лацінцы да 1939 года, калі перайшлі на кірыліцу. Нурмухамедаў тлумачыць прычыну рэформы правапісу наступным чынам: «Першы прэзідэнт Казахстана хоча застацца ў гісторыі не толькі як першы кіраўнік незалежнай казахскай дзяржавы, але і як будаўнік асноў дзяржаўнасці. Ён заклаў новую сталіцу, напрыклад. І зараз сама гістарычная логіка дыктуе, каб лёсавызначальнае рашэнне пра будучыню казахскай мовы было прынята пры ім». Называецца нават дата рэформы — чэрвень наступнага года, калі ў Казахстане адбудзецца курултай цюркскіх народаў. Наколькі можна верыць Бурыхану, цяжка сказаць. Аднак нешта тут сапраўды адбываецца. Так, сайты некаторых міністэрстваў Казахстана маюць лацінскую версію. Дарэчы, палітык лічыць, што перавод казахскай мовы на лацінку дасць штуршок для пачатку падобнай рэформы ў Расіі.

**Па матэрыялах расійскай прэсы**

### ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ. АРЫШТЫ АНТЫМАНАРХІСТАЎ



Напярэдадні цырымоніі вяселля прынца Уільяма і Кейт па брытанскай сталіцы пракацілася хваля затрыманняў найбольш радыкальных удзельнікаў рэспубліканскага руху. У дзень вяселля яны планавалі розныя акцыі пратэсту, якія, на думку паліцыі, падпадаюць пад артыкул «зрыў публічнага свята» (ёсць, аказваецца, такі від злачынства ў брытанскіх законах). Сярод арыштаваных — самая розная публіка: напрыклад, 60-гадовы прафесар, ягоная жонка і сябар- пенсіянер. Троіца збіралася паставіць у цэнтры Лондану гільяціну і адрэзаць галаву фігуры з каронай. Не спадабалася паліцыі і задумка нейкага Чарлі Вейта, які збіраўся правесці перфоманс перад Букінгемскім палацам. Усяго за кратамі на момант заключэння шлюбу аказаліся 52 асобы. Праваабаронцы ўжо крытыкуюць паводзіны паліцыі за замах на грамадзянскія правы. Так, аднаго з рэспубліканцаў затрымалі толькі за наяўнасць у ягоным доме антыманархіцкіх пракламацый.

**Па матэрыялах польскай прэсы**

### ВЕНГРЫЯ. ПРАВЫЯ РАДЫКАЛЫ СТВАРАЮЦЬ АТРАДЫ

JOBBIK MAGYARORSZÁGÉRT MOZGALOM

Партыя «За лепшую Венгрыю» (Йобік), якая займае самы правы фланг венгерская партыйнай сцэны, абвясціла пра намер стварыць атрады самаабароны. Іх першай задачай стане абарона карэнных венграў ад прадстаўнікоў цыганскай меншасці, якіх мясцовыя ультра традыцыйна робяць вінаватымі за ўсе сацыяльныя правалы. Рашэнне пра стварэнне атрадаў таксама накіравана супраць кіраўніцтва МУС, якое, паводле партыі «За лепшую Венгрыю», не ў стане абараніць добрых грамадзян ад цыганскага крыміналу. Не зразумела, якім чынам ініцыятыва пасуе нормам венгерская права. У любым выпадку, яна атрымала падтрымку з боку аднаго муніцыпалітэту, дзе гэта партыя кантралюе мэрыю. Цікава рэагуе на з'яўленне атрадаў самаабароны расійская грамада Венгрыі. Рускія венгры баяцца, што ўся практычная дзейнасць атрадаў «За лепшую Венгрыю» будзе палягаць у тым, каб падчас патрулявання вуліц метадычна рабіць акцыі вандалізму супраць помнікаў савецкім салдатам, якія загінулі ў Венгрыі ў час другой сусветнай вайны.

**Па матэрыялах польскай прэсы**

▸ ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# СЦЯЖНЫЯ РАЗБОРКІ

**Рашэнне Вярхоўнай Рады Украіны наконт падняцця 9 мая чырвонага сцяга на афіцыйных будынках краіны абвастрыла палітычную сітуацыю ў краіне. Пра гісторыю канфлікту і сцэнары на 9 мая журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з кіеўскім палітолагам Юрыем Дакукіным.**



***— Адкуль з'явілася ідэя ўвядзення чырвонага сцяга, і ў чым сэнс пастановы?***

— Сэнс у тым, каб лічыць адной з формаў увекавечвання Дня Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, цытую, «афіцыйнае ўзняцце 9 мая чырвонага сцяга Перамогі на афіцыйных будынках побач з дзяржаўным сцягам». Праект прапанавала група камуністаў, да якіх пазней далучыліся прадстаўнікі Партыі рэгіёнаў. Прычым ініцыятыва была хутчэй сімвалічным адказам на правакацыйнае рашэнне львоўскага абласавету — забараніць у вобласці святкаванне Дня Перамогі і вывешваць 9 мая афіцыйныя сцягі з жалобнай стужкай. Замест таго, каб паўплываць на львоўскіх калегаў, дэпутаты клюнулі на правакацыю і прынялі вельмі супярэчлівы закон.

***— У чым яго супярэчнасць?***

— Пачнём з таго, што суседства побач чырвонага і жоўта-блакітнага сцягоў выглядае вельмі дзіўным з улікам таго, што гэта сімволіка абсалютна полюсных палітычных сіл. Па-другое, даўно існавала практыка, калі гарадскія ўлады па сваёй ініцыятыве вывешвалі 9 мая чырвоны сцяг. Можна было замацаваць такі падыход, пакінуўшы за мясцовымі органамі канчатковае рашэнне. Зараз жа закон патрабуе, каб усе афіцыйныя ўстановы, у тым ліку на захадзе краіны, вывешвалі чырвоныя сцягі. Можна смела канстатаваць: свята 9 мая як мірнага свята ва Украіне больш не будзе. Затое будзе забяспечана тэлевізійная «карцінка» боек тых, хто за і супраць чырвонага сцяга.

> Даўно існавала практыка, калі гарадскія ўлады па сваёй ініцыятыве вывешвалі 9 мая чырвоны сцяг. Можна было замацаваць такі падыход

***— Як рэагавала на прапанову аранжавая апазіцыя?***

— Яшчэ падчас разгляду прапановы ў Вярхоўнай Радзе, аранжавыя спрабавалі заблакаваць трыбуну, аднак безвынікова. Што тычыцца палітычных ацэнак, то найбольш радыкальная частка была рашуча супраць. Я кажу пра партыю «Свабода» Алега Цягнібока. Яны нават пагражаюць чыноўнікам, якія павесяць чырвоны сцяг, прынамсі на захадзе краіны, фізічнай расправай. Што тычыцца памяркоўнай фракцыі, то яна падзялілася. Так, усе цэнтральныя і ўсходнія секцыі Фронту перамен (партыя Арсенія Яцэнюка) віталі рашэнне, а заходнія, наадварот, асудзілі. Хаця сам Яцэнюк усё ж раскрытыкаваў рашэнне. Арыгінальнае выйсце знайшлі сябры Народнай партыі Украіны. Яны прапануюць вывешваць 9 мая сцягі ўсіх краін антыгітлераўскай кааліцыі. А ў дадатак і сцяг бандэраўскай Украінскай паўстанцкай арміі (УПА), якая, па іх словах, таксама зрабіла важны ўнёсак у перамогу над нацызмам.

***— Ці была якая-небудзь рэакцыя з боку львоўскага абласавету, супраць якога ўскосна і быў накіраваны закон пра сцяг?***

— Рэакцыя была. Прычым такая, якую можна было загадзя чакаць. Абласавет і шэраг іншых мясцовых радаў у некаторых заходніх абласцях прынялі рашэнне пра забарону выкарыстання савецкай сімволікі падчас урачыстасцяў з нагоды Дня Перамогі. Пасля гэтага Пётр Сіманенка, лідар камуністаў, запатрабаваў прыняць меры адносна службовых асоб, якія адмовяцца вывешваць чырвоныя сцягі 9 мая.

***— Наколькі варта давераць плёткам пра тое, што 9 мая ў некаторых гарадах Украіны могуць адбыцца сутычкі?***

— На жаль, глеба для такіх спекуляцый ёсць. Пасля дэмаршу львоўскіх уладаў камуністычныя і прарасійскія партыі пачалі кампанію ў падтрымку маршу ветэранаў у Львове. Адзін з лідараў славянафільскай партыі «Родина» збіраецца прывезці ў горад сваіх людзей, каб дасць адпор усім, хто паспрабуе абразіць ветэранаў. Гэта толькі раз'юшыла нацыяналістаў, якія паабяцалі «ўрэгуляваць сітуацыю». Можа, да бойкі справа не дойдзе, аднак тое, што сцягі будуць зрываць, можна амаль дакладна прагназаваць. Прычым не толькі на захадзе краіны. Як правільна піша прэса, пастанова пра сцяг — гэта атака на дзяржаўны дыскурс апошніх 20 гадоў, калі на ўзроўні афіцыйнай прапаганды, сістэмы адукацыі праводзілася паслядоўнай дыскрэдытацыя савецкай спадчыны, у тым ліку і яе сімвалаў. Такая індактрынацыя дала свае вынікі, асабліва сярод моладзі, у тым ліку і на Усходзе.

***— Наколькі вайна вакол сцяга ўплывае на культурны раскол па лініі Усход—Захад?***

— Ад пытання сцяга хутка перайшлі да больш глабальных дэфініцый. Так, камуністы збіраюцца звярнуцца да прэзідэнта УЕФА Мішэля Плаціні і да ўлад Украіны з патрабаваннем... не дапусціць правядзенні Еўра–2012 у «фашысцкім Львове». Думаю, што такі ярлык гучыць агідна для абсалютнай большасці жыхароў гораду.

***— Хіба Партыя рэгіёнаў, прадстаўнікі якой лабіравалі праект закона пра сцяг, не разумела наступстваў свайго рашэння?***

— Думаю, разумела. Ёсць шмат версій наконт сапраўдных матываў іх учынку. Эксперты разглядаюць Закон пра сцяг як рэверанс перад Расіяй, як піяр-акцыю, як імпрэзу «пятай калоны», якая выйшла з падполля, як адэкватны адказ на палітыку «аранжавых», якія таксама грашылі пераглядам гісторыі. Я схіляюся да думкі, што гэта намер за кошт ідэалагічнай канфрантацыі адцягнуць увагу ад сацыяльных праблем. Пры гэтым я сыходжу ў тым ліку з плану заканадаўчай працы дэпутатаў, які нядаўна быў апублікаваны. Там дастаткова цікавых ідэй. Адзін законапраект будзе датычыцца дзейнасці на тэрыторыі Украіны недзяржаўных арганізацый, якія жывуць на заходнія гранты. Ёсць яшчэ знакаміты моўны законапраект Яфрэмава-Сіманенкі-Грынявецкага наконт надання рускай мове статусу дзяржаўнай. Вынясенне гэтага законапраекта, несумнеўна, выкліча чарговы віток супрацьстаяння. Могуць падняць і пытанне пра федэралізацыю краіны. Сутыкненні лбамі жыхароў Украіны па ідэалагічных пытаннях будуць узмацняцца па меры набліжэння да парламенцкіх выбараў.

* * *

На момант выхаду газеты пакуль не з'явілася інфармацыі пра тое, што Віктар Януковіч падпісаў Закон пра чырвоны сцяг (без яго подпісу закон не можа лічыцца дзеючым). Але прэзідэнт Украіны заявіў, што падпіша яго, як толькі закон паступіць у адміністрацыю. Дарэчы, грошы на набыццё чырвоных сцягоў ужо былі выдзеленыя.

ДЭБАТЫ

# ЧЫЯ БЫЛА СІЛЕЗІЯ?

Алег НОВІКАЎ

**Юбілей трэцяга сілезскага паўстання выклікаў цікавыя гістарычныя дэбаты наконт аднаго з польскіх рэгіёнаў.**




90-я гадавіна трэцяга паўстання за далучэнне Сілезіі да Польшчы (яе святкавалі 2 мая) прыйшлася на цікавыя гістарычны час. На апошніх мясцовых выбарах у рэгіянальны парламент Сілезскага ваяводства прайшла партыя «Рух за аўтаномію Сілезіі» (RAS), якая настальгуе па 1920–1930-х гадах. Тады Сілезія мела статус аўтаноміі ў складзе Польшчы.

RAS адразу стала для польскіх правых чырвонай анучай. На пачатку года Яраслаў Качыньскі, лідар партыі «Права і Справядлівасць», заявіў, што для паляка назваць сябе сілезцам значыць зрабіць першы крок на шляху трансфармацыі ў немца. Нямецкая і сілезская грамады Польшчы, у сваю чаргу, запатрабавалі сатысфакцыі.

Гэта абяцала, што без скандалу юбілей падзей 1921 года наўрад ці абыдзецца. Так і здарылася.

Аднак спачатку трошкі гісторыі. Пад тэрмінам «сілезскія паўстанні» разумеюць тры вайсковых чына польскіх патрыётаў у 1919–1921 гадах, якія з дапамогай зброі спрабавалі выправіць памылку Версальскага кангрэсу. Адпаведна Версальскай дамове, польскія землі Сілезіі засталіся ў складзе Германіі. Сілезскія польскія патрыёты, якія актыўна дапамагалі аб'яднанню вайскоўцаў у Польшчы, тройчы ўздымалі паўстанні. Пасля трэцяга Антанта была вымушана абвясціць плебісцыт. Польшча яго прайграла, аднак дыпламатычная місія Антанты ўсё ж пастанавіла перадаць частку так званай Горнай Сілезіі палякам.

Гістарычныя трактоўкі трох згаданых паўстанняў у Польшчы з самага 1921 года (за невялікай папраўкай, пра якую гаворка пойдзе ніжэй) амаль не мяняліся. Удзельнікі паўстання лічыліся героямі як у Польшчы Пілсудскага, так і ў Польшчы камуністаў. Такая дактрына праіснавала да нашых часоў.

Сігналам для пачатку рэвізіі стаў ліст лідара польскіх немцаў Норберта Раша. Пасля таго, як год таму сілезскія ўлады агучылі праграму святочных мерапрыемстваў з нагоды ўгодак паўстанняў, Норберт апублікаваў адкрыты ліст пратэсту. На яго думку, сілезцы ставіліся да ідэй уваходу ў склад Польшчы дастаткова абыякава. Культура сілезцаў, якая складалася ў краі на працягу шматлікіх стагоддзяў, была мультыкультурнай і адрознівалася ад культуры іншых рэгіёнаў Польшчы. Польскія жаўнеры, якія тайна пранікалі ў Сілезію, быццам парушылі гэту ідылію. Вынікам стала грамадзянская вайна, пра факт якой праз 90 гадоў варта хутчэй шкадаваць, чым адзначаць яго на афіцыйным узроўні.

**Пакуль камуністы ахвотна святкавалі юбілеі паўстанняў, у далёкім Парыжы на старонках часопісу «Kultura» друкаваліся артыкулы супраць камуністычнай і «пілсудскаўскай» версій падзей 1921-га**

Тэзісы Раша мабілізавалі ўсю польскую грамадскасць. У шмат чым яны былі плагіятам з нямецкіх падручнікаў часоў нацызму. Іх аўтары таксама вінавацілі Варшаву ў штучным стварэнні польскага супраціву на нямецкіх землях. Пасля перамогі нацыстаў каля гары св. Ганны, дзе ў 1921 годзе мелі месца самыя жорсткія баі, у прысутнасці дзясяткаў тысяч гледачоў быў адчынены вялікі мемарыял, так званы Сілезскі амфітэатр. У карычневай прэсе помнік называлі знакам таго, што Сілезія назаўжды будзе нямецкай.

Пасля вайны ад таго амфітэатра, натуральна, не пакінулі і следу. У маі 1945-га помнік узарвалі. Праз 10 гадоў на тым жа самым месцы быў урачыста адчынены помнік аднаму з паўстанцкіх атрадаў. Новы амфітэатр хутка ператварыўся ў любімае месца правядзення масавых акцый польскіх працоўных супраць спробаў заходніх нямецкіх рэваншыстаў перагледзець мяжу па Одэру — Нейсе.

У 1980-я гады антынямецкая тэма ў польскай камуністычнай прапагандзе амаль знікла. Аднак сцежка да помніка на гары св. Ганны не зарасла. З канца 1980-х сюды пачалі рабіць рэгулярныя вандроўкі рознага кшталту польскія правыя радыкалы і скінхеды.

З'явіўся і трэці погляд. Аказваецца, у сілезскай аўтаноміі ў 1920-я гады трывала доўгая спрэчка паміж ваяводам, дасланым Пілсудскім, і палітычнымі лідарамі сілезцаў. Першы казаў, што сваім далучэннем да Польшчы сілезцы абавязаныя польскаму жаўнеру, які прыехаў сюды і ўзняў антынямецкае паўстанне. Другія, наадварот, казалі, што Варшава нічога не зрабіла для паўстанцаў. Быццам Пілсудскі як выхадзец з Літвы быў больш заклапочаны лёсам крэсаў, чым Сілезіі.

Дыскусія мела арганізацыйны характар. Ветэраны Саюза польскіх паўстанцаў насіліся са сваёй дактрынай, а Народны саюз былых жаўнераў абараняў сваю. Цікава, што ўсіх замірылі камуністы. У 1945 годзе яны загадалі абедзвюм арганізацыям аб'яднацца ў адзін Саюз ветэранаў сілезскіх паўстанняў. Хаця ў агітацыйных матэрыялах часоў Польскай Народнай Рэспублікі больш пазітыўна трактавалі партызан, якія дружна паходзілі з класу пралетарыяту і не жадалі падпарадкавацца дыктату Пілсудскага.

Пакуль камуністы ахвотна святкавалі юбілеі паўстанняў, у далёкім Парыжы на старонках часопісу «Kultura» друкаваліся артыкулы супраць камуністычнай і «пілсудскаўскай» версій падзей 1921-га. Рэдакцыя хутчэй схілялася да таго, што паўстанні былі шмат у чым навязаная звонку. Гэтую лінію спрабавалі ў посткамуністычнай Польшчы праводзіць лібералы. У 2001 годзе на ўрачыстасці, прысвечаныя 20-годдзю паўстання, былі запрошаныя прадстаўнікі нямецкай меншасці. Супраць такога падыходу гучна пратэставалі правыя, якія нават дабіліся адстаўкі ваяводы за тое запрашэнне.

Пасля ўсё супакоілася да цяперашняга юбілею, падчас якога канфлікт гістарычных школ зноў дасць пра сябе ведаць. У кантэксце таго, што тыя школы вельмі палітызаваныя, дэбаты вакол сілезскага паўстання і сілезскай ідэнтычнасці таксама стануць адным з фрагментаў кампаніі па выбарах у польскі сейм, якія адбудуцца восенню.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ГУРБАНГУЛЫ БЕРДЫМУХАМЕДАЎ



Прэзідэнт Туркменістана зрабіў яшчэ адзін крок на шляху ўстанаўлення культу сваёй асобы. Аднак робіць ён гэта вельмі элегантна. Сталічнае ўпраўленне культуры разаслала цыркуляр ва ўсе ашхабадскія рэстараны і кафэ, паводле якога кіраўніцтва гэтых устаноў нясе адказнасць за змест песень, выкананых падчас карпаратыўных вечароў, вяселляў і іншых імпрэзаў. У дадатак супрацоўнікі міністэрства культуры здзейснілі рэйд па кафэ і рэстаранах з мэтай правядзення персанальнага растлумачэння дакумента «дзяржаўнай важнасці». Па іх словах, выканаными песні павінны адпавядаць духу часу, вялікім прарывам эпохі. Прасцей кажучы, усё павінны спяваць пра прэзідэнта. Дарэчы, напярэдадні акцыі было афіцыйна дазволена называць Бердымухамедава эпітэтамі, кшталту «ўлюбёны сын туркменскага народа», «наш заступнік». Цыркуляр гэты даволі супярэчлівы, аднак, як не дзіўна, дае шанец маладым артыстам, якія не маюць грошай на прадзюсераў. Усе згадваюць гісторыю калісьці малавядомага Парахата Амандурдзіева. Ён неяк спеў хвалебную песню прэзідэнту і адразу атрымаў званне заслужанага артыста Туркменістана.

### БАРАК АБАМА



Паведамленне Абамы пра забойства галоўнага тэрарыста планеты стварыла новае вымярэнне прэзідэнцкіх выбараў, прызначаных на наступны год. Шматлікія амерыканскія выданні кажуць пра тое, што Абама гарантаваў сваё пераабранне. У гэтым кантэксце ахвотна ўзгадваць падзеі 24 красавіка 1980 года, калі амерыканскі спецназ не здолеў вызваліць супрацоўнікаў амерыканскага пасольства ў Тэгеране, захопленага ісламскімі экстрэмістамі. Правал аперацыі каштаваў Джымі Картэру пасады прэзідэнта. Сёння сітуацыя адваротная. У рэспубліканскай апазіцыі выбіты важны аргумент — міжнародная слабасць пазіцыі ЗША. Прычым заява Абамы пра Бен Ладэна была зробленая па слядах гучнай кампаніі ў прэсе наконт таго, што Барак быццам не з'яўляецца амерыканцам. Такім чынам Абама здолеў увайсці ў гісторыю не толькі як першы чарнаскуры прэзідэнт, аднак і як палітык, які перамог тэрарызм. Смерць Бен Ладэна, як піша прэса, вярнула амерыканскай нацыі аптымізм і пачуццё таго, што амерыканцы здольныя ставіць перад сабой любыя глабальныя задачы. Сінонімам гэтага настрою стала фігура Абамы, якому цяпер важна проста дацягнуць да восені 2012 года, калі адбудуцца наступныя прэзідэнцкія выбары.

### ЛАРС ЛЁКЕ РАСМУСЕН



Прэм'ер-міністр Даніі прыдумаў, як вырашыць праблему Хрысціяніі (раён у цэнтры Капенгагена, заняты 40 гадоў таму хіпі і анархістамі, які з таго самага часу з'яўляецца прадметам галаўнога болю кожнага дацкага ўраду). З аднаго боку, арэал альтэрнатыўнай моладзевай культуры вельмі прываблівы для турыстаў. З другога — Хрысціянія даўно стала дзяржавай у дзяржаве. Тут можна легальна набыць лёгкія наркотыкі або схавацца ад паліцыі, калі ты нелегал. Праблема Хрысціяніі была вырашана Расмусенам проста. Яе жыхары (тут зарэгістравана 800 чалавек) могуць адкупіцца ад дзяржавы за 20 мільёнаў еўра. Як не дзіўна, такі падыход толькі ўзрадаваў «хрысціян», якім, па іх разліках, патрэбна 39 гадоў працаваць, каб сабраць такую вялізарную суму. Справа ў тым, што ім надакучыла судзіцца з урадам. Апошні працэс цягнуўся 7 гадоў і каштаваў вельмі шмат. Вырашана правесці вялікую кампанію, сабраць грошы і нарэшце паставіць кропку ў гэтай гісторыі. На думку прэсы, шансы ў ініцыятараў кампаніі някепскія. Хрысціянію падтрымліваюць усе мясцовыя левыя партыі. Акрамя таго, практычна няма такіх датчан, якія ў маладосці тут не тусаваліся. Папярэдняя назва кампаніі за тое, каб адкупіцца ад Расмусена, — «Сардэчна запрашаем дадому».

ВАНДРОЎКА

# КВЕТКІ ШЭРЫЛ

## ЯКІЯ КОЛЕРЫ ВАРТА НАСІЦЬ У АМЕРЫЦЫ

Марыя МАРТЫСЕВІЧ



**«Я нарадзіўся ў Дэ-Мойне. Нехта мусіў там нарадзіцца», — піша Біл Брайсан у пачатку сваёй падарожнай кнігі «Страчаны кантынент: па гарадках Амерыкі», адпраўны пункт якой — горад яго дзяцінства, сталіца штату Аява. Прыкладна гэтак жа праводзілі мяне ў Аяву сябры, абазнаныя ў амерыканскай спецыфіцы: «Ну так, не ўсё беларусу Нью-Ёрк. Калі справа даходзіць да ЗША, нехта мусіць ехаць і туды». Гэтак Аява стала маёй малой Амерыкай.**

### «Тое, што здарылася ў кукурузе, застаецца ў кукурузе»

Мідвэст — Сярэдні Захад ЗША — пачынаецца ўжо ў самалёце, які вылятае з Чыкага або Мінеапалісу, калі разгортваеш часопіс паветранай крамы «Sky Mall» і бачыш сярод тавараў гумовыя каўбойскія боты з ярка-ружовымі раслиннымі ўзорамі. Гаворка не пра сам тавар, тэматычна звязаны з колішнімі прэрыямі, што прасціраюцца пад табою, спрэс засеяныя сояй і кукурузай, ператвораныя ў выпасы. Гаворка пра чалавека, на якога ён разлічаны. На старонцы справа — прыбор для шпіянажу за 60 долараў. На старонцы злева — прыбор для выкрыцця прыбораў шпіянажу за 90 долараў. Жыхары Мідвэсту — людзі адкрытыя, зычлівыя, дабрадушныя. «Тое, што здарылася ў кукурузе, застаецца ў кукурузе», — абвяшчаюць сувенірныя майкі ў маленькім аэрапорце, які абслугоўвае адразу некалькі маленькіх гарадкоў навокал. З паліцаў на цябе прывітальна шчэрацца цацачныя пачаткі кукурузы і вясёлыя каровы.

Калі ваш сябар паходзіць з Аявы, то ён, верагодней за ўсё, этнічны немец. І ўсе яго продкі па абодвух лініях таксама этнічныя немцы. Магчыма, у яго крыві будзе які драбок галандскай ці шведскай. Аява — белы штат блакітнавокіх бландзінаў, і ладная частка яго жыхароў не бачыць нічога кепскага ў тым, каб гэтым ганарыцца. Іх продкі ў XVII стагоддзі былі першапраходцамі Аявы, якія выцеснілі з гэтых земляў карэннае насельніцтва. Сёння кожны трыццаты аяванец — уладальнік фермы. На аяванскіх Дажынках — кірмашах з нагоды збору ўраджаю, пясочніцы на імправізаваных дзіцячых пляцоўках насыпаныя кукурузай. Дзеткі зграбаюць шумнае залатое зерне рыдлёвачкамі ў вядзерцы і кузавы цацачных грузавічкоў. Афіцыйныя колеры Аявы — чорны і залаціста-жоўты. Чарназём і кукурузнае зерне.

Штат Аява — самы кансерватыўны з усіх пяцідзесяці. Прынамсі, так кажуць амерыканскія інтэлектуалы. Дзеянні фільму «Гарбатая гара» адбываюцца ў Ваёмінгу хіба таму, што ў Аяве амаль няма гор. На мапе Аява — спод модней квадратнай формы, вышчарблены з двух бакоў: з захаду штат абцякае Місуры, з усходу — Місісіпі. На высокім беразе Місісіпі з боку Аявы вучоныя знайшлі курганы індзейцаў, насыпаныя ў форме ястрабаў, аленяў, мядзведзяў. «Хто пабудаваў гэтыя курганы? Куды зніклі гэтыя людзі? Пытанні без адказу», — кажа добра пастаўленым галівудскім голасам дыктар у адукацыйным фільме запаведніка «Эфіджы маўндз». Мясцовыя жыхары сумленна лезуць на місісіпанскую кручу, каб пахадзіць вакол таямнічых курганаў. «О, я не магу дачакацца, каб пабачыць гэту чароўную прыгажосць восеньскага лесу!» — саркастычна ўскрыквае дзесяцігадовая дзяўчынка, яўна перадражніваючы бацькоў. «Не можаш? Я магу!» — адказвае яе пяцігадовая сястра, якая яшчэ не ведае, што такое іронія.

Але, як пішуць спераду на жаночых майках і ззаду на жаночых нагавіцах, таксама прадаваных у мясцовых аэрапортах, «Не ўсё так плоска ў Аяве».

### «Не ўсё так плоска ў Аяве»

Аява-Сіці — былая сталіца штату. Кукурузны Нью-Ёрк супраць афіцыйнага адміністратыўнага цэнтру — Дэ-Мойну. Апошнія сувеніры, якія намякаюць на каровіна-кукурузную тэматыку, застаюцца на запраўках па-за межамі гораду — поруч з пакункамі цукерак «Свінячыя какашкі». Аява-Сіці — горад-універсітэт, горад навукі і мастацтва. Жывучы ў Аяве, пачуваешся нібы ўнутры вядзьмарскага кола, акрэсленага нейкім добрым абаронцам расавых ды сэксуальных меншасцяў, маладых паэтаў, асацыяльных мастакоў і іншай падобнай публікі. Штат Аява — адзін з самых кансерватыўных у ЗША і, магчыма, таму горад Аява-Сіці — адзін з самых ліберальных гарадоў Амерыкі. Здаецца, менавіта дзякуючы свайму ўніверсітэту штат Аява стаў адным з трох у Амерыцы, дзе — раней за Каліфорнію — дазволілі аднаполыя шлюбы.

Універсітэт Аявы быў адчынены ў 1847 годзе і ганарыцца тым, што стаў першым у ЗША, які пачаў прымаць на вучобу жанчын. Сёння ўніверсітэт ганарыцца іншым дасягненнем: 9% студэнтаў — «нацыянальныя меншасці». Што азначае найперш чорнае насельніцтва. Пры адносна невялікай колькасці афраамерыканцаў у рэгіёне гэта сапраўды вялікі працэнт. Для меншасцяў у ВНУ Амерыкі праце своеасаблівы «сельскі бал». Звязаны ён, канешне, не з месцам жыхарства, а з прыбыткам сям'і студэнта.

Універсітэт Аявы мае статус універсітэта штату. Гэта значыць, дзеці жыхароў штату плацяць толькі чвэрць сумы за навучанне тут. Напрыклад, вучоба на самым дарагім (юрыдычным) факультэце абыдзецца студэнту крыху больш за 6 тысяч долараў на год. Таму, калі Гарвард табе ўсё адно не свеціць, разумней паступіць сюды, каб атрымаць якасную адукацыю за невялікія грошы. У горадзе 60 тысяч жыхароў, 30 тысяч з якіх — студэнты. Абсалютная іх большасць — дзеці фермераў.

Цэнтр Аява-Сіці на абодвух берагах ракі Аява амаль на 100 працэнтаў заняты кампусам — будынкамі ўніверсітэту, студэнцкімі інтэрнатамі, бібліятэкамі, лабараторыямі. У абслузе кампуса — кропках харчавання, паркоўках, транспарце, бібліятэках — працуюць, зразумела, студэнты. Такім чынам, заплачаныя імі ці іх бацькамі грошы за вучобу, з якіх ідуць адлічэнні на інфраструктуру, ператвараюцца ў іх кішэнныя грошы.

Адзіным кіраўніком СССР, які прыязджаў у ЗША з афіцыйным візітам, быў Мікіта Хрушчоў. Не будзе перабольшаннем сказаць, што гэтая паездка была афіцыйным візітам Хручшова ў штат Аява, у госці да фермера Росуэла Гарста, яго амерыканскага сябра, які вучыў савецкіх аграномаў вырошчваць кукурузу.

Але пра гэту кранальную гісторыю сяброўства я даведваюся адно з вікіпедыі. У Аява-Сіці любяць расказваць пра іншых ганаровых гасцей штату. Напрыклад, пра Курта Вонегута, які выкладаў тут творчае пісьмо ў 1960-х і ўвекавечыў пісьменніцкую праграму ўніверсітэта Аявы згадкамі ў рамане «Бойня №5». Пісьменніцкая праграма Аявы — адна з самых знакамітых і прэстыжных у ЗША. Груба кажучы, калі ты намерыўся стаць сур'ёзным творцам, табе — у нашу кукурузу. На аяванскі літаратурны факультэт (аддзяленні прозы, паэзіі, эсэістыкі) з'язджаюцца студэнты з усёй Амерыкі.

Такім чынам, у каго ні ткнеш пальцам на вуліцы, у краме або на лекцыі — трапіш у творцу. У аўтаматычных пральнях, чакаючы, пакуль высахне бялізна, тут чытаюць паэтычныя зборнікі. На панэлі ў кіроўцы гарадскога аўтобуса тут можа ляжаць трактат Імануіла Канта ў арыгінале. Нават піва ў любімым бары табе тут наліваюць маладыя пісьменнікі. Гэта ты ведаеш дакладна, бо ходзіш на іх літаратурныя вечары. Нармальнае жыццё штату Аява, як ён ёсць, урываецца ў горад толькі на выхадных — у дзень першакурсніка, калі ў госці да дзяцей масава заязджаюць бацькі, або падчас футбольных матчаў з удзелам каманды «Iowa Hawks» («Ястрабы Аявы»), якія адбываюцца на стадыёне «Кінік».

Калі табе пашчасціла дастаць білет на стадыён падчас матча, пацікаўся ў прадаўца, «чорны» або «залаты» табе трапіў сектар. І давядзецца апрануць куртку адпаведнага колеру — якім бы геніяльным ты ні быў мастаком або літаратарам.

### «Вырашчаныя тут»

Каб ва ўсёй красе паназіраць змычку «гораду» і «сяла», варта выправіцца суботнім ранкам на традыцыйны фермерскі кірмаш непадалёк ад цэнтру Аява-Сіці. У выпадку дажджу гандлёвыя шэрагі разбіваюцца наўпрост на крытай паркоўцы, ад чаго сутыкненне агранарнага і ўрбаністычнага кідаецца ў вочы яшчэ болей. У выпадку сонца кірмаш абступае ратушу гэтага маленькага кварталу — краму экалагічна чыстай ежы сеткі «Новы піянер». У краме таксама прадаюць патрыятычныя майкі — у квадратным абрысе штату значыцца: locally grown — вырашчанае тут. Каб ежа лічылася па-сапраўднаму экалагічнай, яна павінна быць выробленая непадалёк ад месца продажу, каб на яе дастаўку не трацілася шмат бензіну, які забруджвае паветра.

Фермерскі кірмаш збіраецца па чацвяргах і суботах усю раннюю восень, да самага Хэлоўіна. Тут можна пакаштаваць хатнюю выпечку, набыць свежай садавіны па прымальным кошце, пагутарыць з людзьмі. Сюды ж сцякаюцца і рукадзельніцы з усёй ваколіцы.

Фермерскі дызайн немудрагелісты, шклярусна-пёркавы, на кожным латку абавязкова знойдзецца выраб у чорна-жоўтых тонах. Спалучэнне не самае ювелірнае, затое дарагое сэрцу ўсіх навокал.

Шэрыл сядзіць, як у фатэлі, у адкрытым багажніку сваёй машыны і вяжа. Яна прадае шапачкі, брошкі і іншыя падзелкі ўласнай вытворчасці. «Я вяжу, каб не паўнець болей. Калі я не трымаю ў руках гаплік, я ем», — шырока пасміхаецца яна, сягаючы куткамі вуснаў капюшона сваёй спартовай байкі. Шэрыл каля пяцідзесяці, яна жонка фермера, іх гаспадарка ў 20 кіламетрах ад Аява-Сіці.

Шэрыл вяжа кветачкі, шапачкі і робіць аплікацыі на дзіцячых слінявчыках. Ніткі і тканіну для сваіх працаў яна здабывае, распорваючы старыя рэчы: «I recycle», — з гонарам паведамляе яна. Перапрацоўваць старыя рэчы — такі ж трэнд апошняга часу, як адмаўляцца ад фаст-фуду. Перапрацоўваць старызну — другая новамодная манія амерыканцаў пасля арганічнай ежы. Сліняўчыкі ў Шэрыл выходзяць вельмі прыгожыя.

Тут у Аяве, у дачыненні з яе «няпростымі» жыхарамі — літаратарамі і аматарамі літаратуры і «простымі» — фермерамі і іх сямейнікамі — я збольшага і бавіла свой час у Амерыцы. Напачатку я была перакананая, што жыццё ў маленькім горадзе пасярод кукурузы — не тое, што будзе мне даспадобы. Але калі надышоў час развітвацца з сонечнай Аявай, гэтае развітанне атрымалася нечакана слёзным. Я, зразумела, не была «вырашчаная тут», але за такі непрацяглы час неяк незаўважна да гэтага ўсяго прырасла. І, хоць лістапад у Аяве выдаўся сонечным і цёплым, пакідаючы штат сваёй часовай прапіскі, я не ўтрымалася ад рытуалу. Я пакідала Амерыку ў цёплай жоўтай куртцы з прычэпленай на яе вязанай кветкай Шэрыл.



**ПАМЯЦЬ**

# ГОЛАС ЯЦЭКА КАЧМАРСКАГА

Аляксей ХАДЫКА

**Гэты эпізод адбыўся 20 красавіка ля «Кнігарні Логвінаў» у той час, калі сустрэчай з польскім перакладчыкам Набокава Лешэкам Энгелькінгам завяршаўся месячнік польскай культуры, арганізаваны Польскім Інстытутам. Я спытаў прадстаўніка Інстытута, чаму замест спрыяння прыезду ў Беларусь знакавых асоб Інстытут займаецца карыснай, але неабавязковай культурніцкай дзейнасцю. Чаму б не запрасіць Леха Валенсу? «Што вы, — быў адказ, —гэта немагчыма з многіх прычынаў». — «Чаму не Яцэк Качмарскі, голас «Салідарнасці»?» — «А вы не ведаеце, ён памёр…» Мне зрабілася сорамна.**





24 красавіка 2004 года, пад шалёным дажджом, Варшава развіталася з Яцэкам Качмарскім. Нехта з карэспандэнтаў напіша потым: як Масква развіталася з Высоцкім пад спякотным сонцам, так Варшава з Качмарскім — пад дажджом. Знакі прыроды, якія звязалі гэтыя галасы сумлення дзвюх краін, якія былі звязаныя і пры жыцці.

Высоцкі, ажаніўшыся з Марынай Уладзі, нярэдка сустракаўся з ёй пасярэдзіне шляху паміж Масквой і Парыжам — у Варшаве. І амаль заўсёды яны гасцявалі ў кватэры рэжысёра Ежы Гофмана. Таго самага, які зняў трылогію паводле Генрыка Сянкевіча — «Агнём і мячом», «Пан Валадыеўскі», «Патоп».

А бацькі Яцэка — тата Януш Качмарскі, з 1972-га доўгія гады кіраўнік Саюза Польскіх мастакоў, і маці, Ганна Траяноўская, гісторык мастацтва — ведалі Ежы Гофмана яшчэ з часоў агульнага для ўсіх траіх навучання ў СССР у другой палове 1950-х гадоў. Так і адбылося, што вясной 1974 года ў кватэры Гофманаў 17-гадовы Яцэк Качмарскі пазнаёміўся з 36-гадовым Уладзімірам Высоцкім.

Гэта быў той момант, калі студэнт аддзялення паланістыкі Варшаўскага ўніверсітэта зразумеў, што ягонае пакліканне — музыка і сцэна. Пазней ён скажа: «Я зразумеў, якое ўражанне робіць твар, напоўнены экспрэсіяй, калі артыст выпраменьвае з сябе гэты незвычайны голас. І я падумаў: гэтая роля — для мяне, я хачу гэтак жа перажываць тое, што раблю».

Далей быў дэбют і поспех на Варшаўскай Ярмарцы Спеваў у 1976-м, пераклады і прысвячэнні Высоцкаму, у тым ліку журналісцкая ўзнагарода на Фестывалі песні ў Аполе 1981 года за твор «Эпітафія Уладзіміру Высоцкаму». У тым самым годзе нараджаліся новыя праграмы: «Музей» — паэтычныя прысвячэнні класічным творам жывапісу, што адлюстроўвалі падзеі апошніх 200 гадоў гісторыі Рэчы Паспалітай (у тым ліку карціне Яна Матэйкі «Рэйтан»). Праграма «Крык», з асноўным творам у гонар аднайменнай жывапіснай работы Эдварда Мунка. І, нарэшце, «Муры» — знакаміты гімн заранку «Салідарнасці». Апошні, дарэчы, вельмі пасуе сённяшняй беларускай сітуацыі і перакладаўся Рыгорам Барадуліным разам з Лявонам Баршчэўскім (не цалкам), выкарыстоўваючыся ў якасці гімна забароненага ліцэя імя Коласа. А нядаўна — у поўнай форме — Андрэем Хадановічам, і ў гэтай форме гучаў 19 снежня 2010 года на плошчы і выконваўся таксама Зміцерам Вайцюшкевічам. Тэкст друкаваўся ў «НЧ» 14 студзеня гэтага года.

Ваеннае становішча ў Польшчы заспела Яцэка Качмарскага на гастролях у Францыі, і ў Польшчу спявак не вярнуўся. Яго выступы ў ЗША, Канадзе, Аўстраліі, ПАР, Ізраілі, большасці краін Заходняй Еўропы спрыялі падтрымцы справы падпольнай «Салідарнасці» на радзіме. З 1984 года ён пачаў весці ўласную перадачу «Квадранс Яцэка Качмарскага» на хвалях Радыё «Вольная Еўропа» з Мюнхена. Яго голас здалёк гучаў у Польшчы як голас няскоранага сумлення народа. Як у песнях, так і ў актуальных палітычных каментарах. Ён працаваў на радыё аж да закрыцця там польскай секцыі ў 1994 годзе, хаця ўжо з 1990-га жыў у Польшчы. А ў 1995-м з'ехаў жыць у Аўстралію, хаця канцэрты на радзіме ніколі не спыняў. У 2002 годзе ў яго дыягназавалі рак страваводу, але ён адмовіўся ад аперацыі, баючыся страціць голас… Дапамога дабрачыннымі канцэртамі шматлікіх музыкаў, уключаючы добра вядомых у нас «Скальдаў», не дапамагла. 10 красавіка 2004 года голас сумлення Польшчы назаўсёды змоўк у шпіталі Гданьску.

Чаму Яцэк Качмарскі часта прыгадваецца менавіта зараз? Каб адказаць на гэтае пытанне, дазвольце прывесці яшчэ адзін верш-песню геніяльнага творцы, таксама нядаўна перакладзены Андрэем Хадановічам. Першая частка песні паўстала 7 мая 1983 года, астатняе дапісана 3 чэрвеня 1987-га.

А ўвогуле, цікава, як пераплятаюцца карані і лёсы тых, хто ментальна і фізічна з'яўляецца нашчадкам Рэчы Паспалітай і ВКЛ. Высоцкага, унука габрэя з Высокага ля Берасця, Качмарскага з Варшавы, у жылах якога таксама былі дамешкі габрэйскай і татарскай крыві, і нас, грамадзян шматнацыянальнай Беларусі.

### Наш клас

*Раскажы, што з нашым класам? —*
*Піша Павал з Тэль-Авіва.*
*Цяжка выжыць гэтым часам,*
*А тым болей — жыць шчасліва.*
*Раскажы, што з нашым класам?*
*Чэсь у шведскім порнаклубе.*
*Кажа, добра плацяць асам.*
*Зрэшты, кожны гэта любіць.*

*Грамадзянамі Канады*
*Хутка будуць Пётр і Кася,*
*Ян у Францыі даў рады,*
*Бася ў Штатах засталася.*
*Госька з двойняй пад Варшавай,*
*Цераз месяц будзе трэці.*
*Час валіць — з такой дзяржавай*
*Ёй нічога тут не свеціць.*

*Магда выйшла за мадрыдца,*
*Што павёўся на цяжарнасць.*
*А Мацей не змог скарыцца*
*І памёр за Салідарнасць.*
*Магда сябравала з Юркам,*
*Што быў зоркай школьнай сцэны.*
*Юрка добрым стаў хірургам,*
*Але брат яго ўскрыў вены.*

*Філ стаў фізікам, вядома,*
*І ў Маскве зрабіў кар'еру.*
*Кожны год бывае дома,*
*Сябра нашаму прэм'еру.*
*А Міхась у турмах высах,*
*Бо не стаў страляць у Стася.*
*Я ж складаю жыццяпіс іх.*
*Вось і ўсе, хто быў у класе.*

*Хтосьці з'ехаў, хтосьці ў Польшчы,*
*Хтосьці заўтра — у дарогу,*
*Хтосьці ўжо даўно нябожчык,*
*Хтось жывы — і дзякуй Богу!*
*Я збіраў усіх старанна,*
*Я праводзіў паралелі,*
*Быццам сыпаў соль на раны,*
*Раны моцна не балелі.*

*Сталі жонкамі дзяўчаткі,*
*Хлопец — дзедам. Хутка фініш.*
*Маладосць паўзе спачатку,*
*А пасля яе не спыніш.*

*Кожны — бог у сваё сорак,*
*Спіць даўно ў сваёй пасцелі.*
*Нібы ўсе ляцім да зорак,*
*А ці гэтага хацелі?*

*Што са мной? Пра што я мару?*
*Памяць мучае старая,*
*Быццам мацае іх твары*
*І ўсляпую паўтарае*
*Ўсе дзіцячыя абліччы,*
*А яны — наўцекача.*

*Я ж чакаю, хто пакліча*
*Ў хованкі або ў квача…*

*Прарастаючы паволі,*
*Кожны цягне што ёсць сілы*
*Лісце, парасткі і голле*
*Ад калыскі да магілы,*
*Каранямі — з таго свету,*
*Хтосьці ўправа, хтосьці ўлева…*
*Аж не верыцца, што гэта*
*Ўсё — адно і тое ж дрэва.*

**ЗВАРОТ**

## БЕЛАРУСКІМ ДЗЕЦЯМ НАВУЧАННЕ ПА-БЕЛАРУСКУ

**29 красавіка Сакратарыят Таварыства беларускай мовы прыняў зварот да ўсіх неабыякавых людзей, у якім заклікае да працы па рэальным пашырэнні ўжывання беларускай мовы. Прапануем яго нашым чытачам.**

Пачынаючы з 1959 года на Беларусі мэтанакіравана зачыняліся беларускамоўныя ўстановы адукацыі ўсіх узроўняў, нават беларускую літаратуру ў сталічных школах часам выкладалі па-руску. Сітуацыя пачала мяняцца да лепшага толькі ў перыяд з 1990 па 1995 гады, калі большасць першакласнікаў у краіне пачала навучацца па-беларуску.

Аднак пасля рэферэндуму 1996 года і адпаведных зменаў у Канстытуцыі і Законе аб мовах сістэма бесперапыннай беларускамоўнай адукацыі ў Беларусі прыйшла ў заняпад. Зараз у краіне амаль адсутнічаюць беларускамоўныя дзіцячыя садкі, а колькасць вучняў, што навучаецца на мове тытульнай нацыі, скарацілася да 18%. Раней гарадскія дзеці вучыліся роднай мове на вёсцы ў сваіх бабуль і дзядоў. Аднак цяпер вёска вымірае, а ў горадзе далёка не кожны дзед ці бабуля валодае мовай продкаў.

Таму ТБМ прапануе стварыць Усебеларускі бацькоўскі камітэт трох узроўняў з мэтай забеспячэння навучання сваіх дзяцей па-беларуску. Спачатку маладыя бацькі аб'ядноўваюцца з мэтай выхавання сваіх дзяцей па-беларуску ў дзіцячых садках, потым — для навучання ў школе, а калі дзеці дойдуць да 10–11 класа, паўстане неабходнасць адкрыцця беларускамоўных плыняў і груп у ВНУ. 8 красавіка быў створаны Мінскі гарадскі бацькоўскі камітэт з бацькоў Фрунзенскага раёна горада. Зараз да іх далучаюцца бацькі з іншых раёнаў.

Мы заклікаем стварыць такія камітэты ў іншых гарадах, а потым аб'яднаць іх у адзіную структуру з адпаведным узроўнем каардынацыі і банкам звестак.

Ахвотныя далучыцца могуць скантактавацца з Сакратарыятам ТБМ па электроннай пошце siadziba@gmail.com, па тэлефоне (017) 284–85–11 (у будні дні з 17 да 19 гадзін).

Заклікаем усіх ахвотных да агульнай працы па рэальным пашырэнні ўжывання беларускай мовы.

ЮБІЛЕЙ

# Васіль Якавенка: «СВАЯ ЗЯМЛЯ, СВАЯ ГІСТОРЫЯ, КУЛЬТУРА, МОВА…»

**Пісьменніку і грамадскаму дзеячу Васілю Якавенку споўнілася 75 гадоў. Шмат здзейснена. І багата планаў. Напярэдадні юбілею з ім сустрэўся музычны аглядальнік Вітаўт Мартыненка. Урыўкі з іх працяглай гутаркі мы прапануем чытачам «НЧ».**



***— Спадар Васіль, пасля вашай трылогіі «Пакутны век», пра якую дагэтуль не змаўкаюць дыскусіі ў прэсе, вас не назавеш сціплым літшарагоўцам. Вы недзе ў друку зазначылі, што пачыналі з вершаў. Дык якое было развіццё вашай паэтычнай эпапеі?***

— Паэтычнай эпапеі ў мяне не склалася. Паэтыкай, умоўна кажучы, займаўся дзеля пацехі. Я быў дужа начынены савецкім патрыятызмам, не раўнуючы як Паўлік Марозаў. Нешта падказвала мне, студэнту тэхнікума, нават стварыць гурток для паглыбленага вывучэння гісторыі партыі. У выніку такога душэўнага гарту, аднак, і вылезла з мяне на паперу паэма, прысвечаная… каму б ты думаў?

***— Радзіме?***

— Не… А вось тым… Тым, на каго нас у свой час прывучалі маліцца: *Ленин и Сталин — два горных орла,// Любовь к человеку их вместе свела…* Лекі ж ад графаманства мне дала геалагічная прафесія, палявыя ўмовы працы і знаходжанне ў гушчы народа. Летам 1954 года, знаходзячыся на практыцы ў гідрагеалагічнай экспедыцыі на Брэстчыне, напісаў вялікі і сацыяльна востры, як мне цяпер здаецца, нарыс «Аброва». Ён спадабаўся газеце, і цяпер думаю: ці не з'яўляецца опус «Аброва» ўжо «заліковым» на мой мастацка-публіцыстычны гарт?

***— На творчым шляху ёсць вехі, калі пісьменнік адчувае, што яго заўважылі. Для вас гэта, пэўна, было на мяжы 1960–1970-х?***

— Выключна важным і чынным быў водгук на выхад з друку майго рамана «Надлом». Пераказваю: «Раман-эпапея, падобных якому ў беларускай літаратуры даўно не было… Вобразы дзейных асоб атрымаліся псіхалагічна дакладнымі, праўдзівымі. Раман мае рысы прыгодніцкага і гістарычнага адначасова. Чытаецца ён цікава. Твор глыбокі і, можна сказаць, нават эпахальны…» (Штотыднёвік «ЛіМ». Святлана Явар).

***— Часам нам, беларусам, прыпісваюць залішнюю сціпласць альбо, наадварот, перабольшваюць нашу палітызацыю: варта загаварыць па-беларуску, і цябе ўжо ў БНФ запісваюць. Папулярны беларускамоўны пісьменнік увогуле разглядаецца як лідар цэлага руху. А ці шмат палітыкі ў вашых раманах і нарысах?***

— Апошнім часам у нашай краіне шыюць палітыку да ўсяго. І, калі ты сам не ідзеш у палітыку, дык яна да цябе ў акно залезе! Народ запалоханы, і гэта зніжае ягоны творчы патэнцыял, маральна прыгнечвае. Шараговыя грамадзяне затойваюцца. Мараль хістаецца. Дэмаграфія мінусуе. А як і кім адлюстроўваюцца ў літаратуры гэтыя працэсы? Падумаем… Асобная тэма… І вось калі ты не абыходзіш тэму народа і нацыі, вайны і міру, мінулага і сучаснасці, тады з усяго гэтага і тчэцца палітычнае палатно як аснова твора. Так здарылася і падчас працы над «Надломам», які даследчыкі называюць гістарычным, што і зразумела, а яшчэ і нацыянальным, і палітычным раманам. Палітыкі там дастаткова.

***— У «Пакутным веку», дзе віруюць моцныя жарсці польскай, нямецкай і савецкай акупацыі, вы неяк захоўваеце незаангажаванасць, аб'ектыўнасць, цвяроза паглядаеце на жыццё збоку. Як гэта ўдалося?***

— Сам здзіўляюся. Я ж навічок у гэтым цяжкавагавым жанры. Мне ўяўлялася, што я выйшаў на небывалы для сябе панарамны твор і, калі так, у маіх руках цяпер аказаліся дзясяткі і сотні гістарычных асоб з розных бакоў палітычных бар'ераў. Усе яны — мае персанажы, усе, так бы мовіць, дзеці майго мастацкага твора і павінны карыстацца аднолькавай ласкай у аб'ектыўнай падачы. Мне, пэўна ж, удалося прыўзняцца над сваімі героямі і паказваць падзеі, учынкі, характары ўжо з агульначалавечых, з гуманных, варта зазначыць, пазіцый, паказаць таксама ж свет праз вочы саміх герояў.

***— Чуў пра вашу будучую кнігу: Маркс, Энгельс, Ленін, Беларусь… Што гэта будзе?***

— Гістарычныя асобы, якіх ты, браце, назваў, згадваюцца ў кнізе, але толькі яны больш не робяць пагоды, і ўжо люд пра іх начытаўся, ад іх напакутаваўся і хацеў бы забыць. Варта, аднак, зразумець іх прынцыповыя пралікі. Духоўная дэградацыя ўсё больш упэўнена правіць баль у Еўропе і на Беларусі. Адзінае, што здольна адвесці наш народ ад прорвы (куды ён можа неўзабаве скаціцца разам з усім светам альбо асобна, раней ад іншых), гэта вяртанне яму сапраўднай нацыянальнай ідэі, якую скралі ды падмянілі, даруйце на слове, міліцэйскай дубінкай. А яшчэ нашаму люду пільна патрэбна самаідэнтыфікацыя, праведзеная на спалучэнні гісторыі з сучаснасцю. Беларусы павінны пачуваць сябе беларусамі.

***— 75 — сур'ёзны век, а для многіх вы ўсё яшчэ новае імя ў нашай не надта беларускай Беларусі. Назавіце вашы галоўныя мары, памкненні?***

— Дажыць да прасветлай гадзіны на Беларусі, каб сваё было сваім і цанілася як нацыянальны скарб, як падарунак лёсу. Я ў свой час зрабіў адмысловы ўнёсак у абарону прыроды Палесся ад гвалтавання і знішчэння яго меліяратарамі, пра што расказана ў кнізе «Крушэнне на ростані». Цяпер гэтага мала. Цяпер наогул цяжка разабрацца, хто ў нас гаспадарыць на зямлі і ў прыродзе. Я тут паўтару пытанне, якое ставіў у сваім дакладзе на прадстаўнічай канферэнцыі ў Мінску 22 гады таму: «Ці ёсць у нас канцэпцыя гаспадарання?» Мае калегі-экалагі тым часам падказваюць: прыспеў час памяняць філасофскія арыенціры ў ахове прыроды і сцвярджаць не «Зямля — наш агульны дом», а проста і непасрэдна «Зямля — наша маці!». Сёння, як ніколі, важна выпрацаваць у краіне канцэпцыю гаспадарання не часовых людзей, а народа і нацыі. І яшчэ як мага больш бараніць зямлю, бараніць прыроду, выхоўваць экалагічную свядомасць у чалавеку. Мы павінны зрабіць усё, пакуль зямля не сканала і перад сконам не знішчыла нас, недарэк і дурняў з амбіцыямі непамернымі. Адно вось пытанне: ці хочам мы гэтага?.. Свая зямля, свая гісторыя, культура, мова, нацыя — пакуль жывы народ — рэчы непадзельныя!

***Шчыра віншуем спадара Васіля Якавенку з юбілеем і зычым яму добрага здароўя, новых творчых поспехаў.***




Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет».
г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 486

Падпісана да друку 06.05.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.